СЕМ МЕДАЛЁЎ АД БЕЛАРУСАЎ 5

КУЛЬТУРНАЯ БАРАХОЛКА Ў МІНСКУ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

11 ЖНІЎНЯ 2021 г. СЕРАДА № 152 (29521)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«Сёння развіццё нашай эканомікі адбываецца ва ўмовах двайнога ўдару. Па-першае, на яе працягвае аказваць уплыў пандэмія. Па-другое, — санкцыйныя абмежаванні асобных заходніх краін. Тым не менш, беларуская эканоміка ўстойліва расце. Па выніках першага паўгоддзя ВУП склаў 103,3 %. Найбольшы ўнёсак — больш за 80 % прыросту — забяспечвае прамысловасць. Аб'ём вытворчасці ў параўнанні з мінулым годам павялічыўся больш чым на 10 %. Важна, што гэты рост забяспечаны высокатэхналагічнай і экспартна арыентаванай прадукцыяй: вылічальнай, электроннай і аптычнай апаратурай, прадукцыяй машынабудавання, дрэваапрацоўкі і фармацэўтыкі. То-бок, гэта тыя галіны, на якія мы рабілі стаўку і правялі мадэрнізацыю. Але галоўнае, спрацавала прынятае летась стратэгічна правільнае рашэнне — не спыняць эканоміку і працягваць працаваць. У выніку захаваныя вытворчасці, кампетэнцыі, кадры, што стала асновай сённяшняга выніку».

Запас бяды не чыніць

Надзея ВАШКЕВІЧ — 82-гадовая жыхарка Жодзіна, у сваім паважным узросце застаецца заўзятай агародніцай і кулінарам. Яе аптымізму можна пазайздросціць! Кожны год на дачным участку пенсіянеркі багата родзяць традыцыйныя гароднініа і садавіна, і без дапамогі іншых яна своечасова ўпраўляецца з новым ураджаем. Жыве з пазітыўнымі працоўнымі дэвізамі: летні дзень год корміць ды запас бяды не чыніць. З маладосці Надзея Дзмітрыеўна прывыкла ўсё рабіць сваімі рукамі — ад пасадкі да ўборкі. Ведае шмат рэцэптаў нарыхтовак, дзеліцца імі з суседзямі і сябрамі. І, вядома, частуе сваімі вітамінныміі вырабамі. Жыццё жодзінскага ветэрана працы (а Надзея Вашкевіч адзначана адпаведным медалём) прайшло ў адным з «белазаўскіх» дзіцячых садкоў, дзе яна была спачатку нянькай, потым — кухарам. Веды і ўменне ў кулінарыі ёй і дагэтуль ёсць куды прыкласці.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

РАТАВАЛЬНІКІ НА ЖНІВЕ

Што робяць супрацоўнікі МНС, каб максімальна захаваць ураджай?

Жніво — гарачая пара не толькі для аграрыяў. У зборы ўраджаю задзейнічаны прадстаўнікі самых розных прафесій. Ужо каторы год запар не застаюцца ўбаку і супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Прычым ратавальнікі не толькі адказваюць за пажарную бяспеку на палях і ў зернясховішчах, а самі бяруць непасрэдны ўдзел ва ўборцы. **СТАР. 4**

Радзімазнаўства. Адрасы пісьменства

Сумесны праект Мінаблвыканкама і «Звязды»

У КЛЕЦКУ ЎСЁ ПА-СВЕЦКУ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Клецк (Клечскъ, Кліцкъ) упершыню згадваецца ў летапісах у 1127 годзе. Узнікла паселішча на месцы феадальнага замка на беразе ракі Лань і з'яўлялася цэнтрам княства ў складзе Турава-Пінскай зямлі. У XIV стагоддзі Клецк уваходзіць у склад Вялікага Княства Літоўскага. Мястэчка неаднойчы спустошалася набегамі крымскіх татараў. Аб крывавай бітве 1506 года напісаны творы, у прыватнасці, раман Віктара Чаропкі «Храм без бога». «Невялічкая рачулка Лань ляжала паміж войскамі. Яна, нібы адчуваючы хуткую крывавую бойню, самотна шамацела хвалямі аб прыбярэжны жвір, бы плакала над сваім гаротным лёсам. Колькі ўдовіц, колькі мацярок, колькі нявестаў пракляне яе нядобрым словам. На адным яе беразе стаяла 30-тысячная татарская раць, на другім — 10 тысяч войска Вялікага Княства Літоўскага пад камандаваннем маршалака Міхаіла Глінскага», — піша аўтар. **СТАР. 8–9**

КАРАТКА

• **Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду выпрацаваць комплекс дадатковых мер супраць чарговага санкцыйнага ўдару, які распачалі краіны Захаду ў дачыненні да Беларусі. Пра гэта заявіла прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля Эйсмант.**

ISSN 1990 — 763X

Актуальна

НА АСАБЛІВЫМ КАНТРОЛІ

Вакцынацыя, гатоўнасць медустаноў да новай хвалі COVID-19 і развіццё сістэмы аховы здароўя сталіцы

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла традыцыйную нараду па пытаннях дзейнасці ў перыяд распаўсюджвання COVID-19 у Мінску. Праўда, фармат з відэа-канферэнц-сувязі памянялі на вочны — сустрэча прайшла на базе Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. У размове са спецыялістамі спікер верхняй палаты парламента закранула пытанні вакцынацыі на прадпрыемствах і вакцынацыі пажылых людзей. Былі абмеркаваны таксама пытанні наяўнасці лекавых сродкаў, функцыянавання высокатэхналагічнага абсталявання і іншыя. У нарадзе таксама браў удзел мэр сталіцы Уладзімір КУХАРАЎ.

Нагадаем, што Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка яшчэ ў пачатку пандэміі COVID-19 даручыў Старшыні Савета Рэспублікі як упаўнаважанай па Мінску ўзяць пад асабісты кантроль работу сістэмы аховы здароўя горада. Наталля Качанава курыруе ўсе праблемныя пытанні аховы здароўя сталіцы, пастаянна наведвае адпаведныя ўстановы, праводзіць сустрэчы з калектывамі.

Як паведаміў у пачатку нарады **міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ,** згодна з ацэнкамі экспертаў, рост захваральнасці на COVID-19 у сталіцы прагназуецца ў кастрычніку. Таму, на яго думку, вельмі важна аддаць асаблівую ўвагу вакцынацыі мінчан, асабліва з улікам прытоку студэнтаў, якія будуць вяртацца да навучання пасля летняга адпачынку.

Разам з тым, міністр адзначыў работу, якая праводзіцца ў сталіцы па вакцынацыі насельніцтва і падзякаваў усім, хто мае да гэтага дачыненне.

— Цяпер будзе павялічана пастаўка вакцын усіх відаў, і таму, я мяркую, што алгарытм, які склаўся па вакцынацыі (у тым ліку ў тэрытарыяльных, шпітальных установах аховы здароўя і грамадскіх месцах), мы павінны працягваць і ўзмацняць, — падкрэсліў ён.

Міністр засяродзіў увагу на гатоўнасці стацыянарных устаноў аховы здароўя да асенне-зімовага перыяду, таксама адзначыўшы тры асноўныя кампаненты ў дадзенай рабоце: наяўнасць кадраў, медыкаментаў і ахоўных сродкаў у дастатковай колькасці.

Пры наяўнасці чэргаў на вакцынацыю іх трэба аператыўна разводзіць, адзначыла Наталля Качанава. Усё гэта складнікі паспяховай барацьбы з распаўсюджваннем небяспечнай хваробы.

Акрамя таго, у цэнтры ўвагі Старшыні Савета Рэспублікі былі і пытанні будаўніцтва трэцяй чаргі лячэбнага корпуса 5-й бальніцы Мінска. Удзельнікі нарады наведалі лячэбна-дыягнастычны цэнтр, фізіятэрапеўтычнае і функцыянальна-дыягнастычнае аддзяленні, барацэнтр новага комплексу, ізатопную лабараторыю.

Плануецца, што ў гэтым корпусе будуць размяшчацца аперацыйныя, рэанімацыйныя, прыёмнае аддзяленні, кансультацыйны цэнтр. У планах таксама адкрыццё кабінета МРТ. Увесь комплекс плануецца адкрыць у 5-й бальніцы ў найбліжэйшыя месяцы.

Нагадаем, што 5-я гарадская клінічная бальніца сталіцы з'яўляецца буйной шматпрофільнай лячэбна-прафілактычнай установай, якая аказвае высокакваліфікаваную медыцынскую (лячэбна-дыягнастычную і кансультацыйную) дапамогу як мінчанам, так і жыхарам Беларусі і замежжа.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Наша пазіцыя

«Агалілі сапраўдныя мэты сваёй палітыкі»

Міністэрства замежных спраў выступіла з заявай, дзе асудзіла прынятыя ЗША, Вялікабрытаніяй і Канадай 9 жніўня санкцыі супраць Беларусі.

Як сцвярджае МЗС, гэтыя краіны ў чарговы раз прадэманстравалі поўнае пагарджанне міжнароднага права, уласных міжнародных і двухбаковых абавязацельстваў, агалілі сапраўдныя мэты сваёй палітыкі ў дачыненні да Беларусі.

«Прыкрываючыся крывадушнымі лозунгамі абароны правоў чалавека і дэмакратыі, на справе нашы заходнія апаненты кіруюцца халодным геапалітычным разлікам. Іх дзеянні непасрэдна накіраваныя на падрыў суверэнітэту і незалежнасці Беларусі, дабрабыту і працвітання беларускага народа», — гаворыцца ў паведамленні міністэрства.

Паводле заявы, адзінае, чаго дамагаецца Захад, — змена ўлады ў Беларусі, і ў ход ідзе ўвесь арсенал метадаў «халоднай вайны» ў выглядзе нарошчвання знешняга палітычнага і інфармацыйнага ціску, увядзення авіязамбарга, выкарыстання спорту ў палітычных мэтах, аж да фінансава-эканамічнага ўдушэння дзяржавы.

МЗС акцэнтуе ўвагу, што ўведзеныя аднабаковыя меры ў дачыненні да нашай краіны супярэчаць Статутам ААН і нормам міжнароднага права, іх абавязацельствам ў рамках АБСЕ.

Меркаванні і ўражанні

«Ключы ад Беларусі — у сэрцы беларусаў і на тэрыторыі краіны»

«Вялікая размова з Прэзідэнтам» яшчэ доўга будзе абмяркоўвацца ў нашым грамадстве, бо падчас яе кіраўнік дзяржавы закрануў пытанні, якія цікавяць многіх. Мы папрасілі падзяліцца думкамі і ўражаннямі як непасрэдных удзельнікаў сустрэчы, так і тых, хто з цікавасцю назіраў за яе прамой трансляцыяй.

Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы:

— Калі перадаць уражанні адным сказам, то гэта — мощ, упэўненасць у сабе і выразнае разуменне стратэгічных і тактычных планаў Беларусі на будучае. Калі казаць разгорнута, па-першае, гэта найважнейшыя тэзісы, якія павінны пачуць усе. Беларусь застаецца суверэннай незалежнай дзяржавай, і гэта навекі і назаўсёды. Менавіта такі самы галоўны меседж Прэзідэнта, які праходзіў чырвонай ніткай ад першага сказа да апошняга. Па-другое, Беларусь не збіраецца мяняць стратэгічных саюзнікаў і кудысьці ісці, бегчы і тым больш перад кімсьці капітуляваць і падымаць рукі. Па-трэцяе, нягледзячы на ўсю сітуацыю, Беларусь адкрытая да супрацоўніцтва, да раўнапраўнага партнёрства, у тым ліку з Еўрасаюзам і Злучанымі Штатамі, але на роўных, без дыктоўкі, зневажанняў, абраз і ўмяшання ў суверэнныя справы нашай краіны. Усё гэта фундаментальныя рэчы, якія праходзяць праз усю размову. І самае галоўнае, Беларусь не застаецца статычнай, застылай дзяржавай, і тыя нашы ўнутрыпалітычныя праблемы і канфлікты, якія мелі месца летась, мы вырашым самі праз канстытуцыйную рэформу, праз пазітыўныя эвалюцыйныя змены палітычнага ладу, праз змены, якія мы ўсе разам рыхтуем. Беларусь прайшла вельмі адказны этап свайго развіцця, мы выбудавалі дзяржаўныя інстытуты нашай суверэннай краіны. Мы не бананавая рэспубліка і нікому не дазволім сабой распараджацца. Мы гатовы змяняцца эвалюцыйна, як цывілізаваная нацыя праз канстытуцыйныя змяненні. А калабарацыяністы і кампрадоры павінны зразумець: ключы ад Беларусі знаходзяцца ў сэрцы беларусаў і на тэрыторыі Беларусі. Ніякія чужыя грошы і пернікі нікому не дапамогуць прыйсці да ўлады ў краіне. І гэта трэба засвоіць.

Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ, старшыня Столінскага райвыканкама, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:

— Асабіста мяне ў «Вялікай размове» зачапіў пасыл Прэзідэнта аб тым, што галоўнае — гэта працаваць, ствараць дабрабыт эканомікі і кожнага чалавека. «Хачу, каб у нас была спакойная краіна, усё астатняе мы купім. Нам няшмат трэба. Каб купіць, мы грошы знойдзем», — сказаў кіраўнік дзяржавы, дадаўшы, што ў асноўным сваімі мазгамі, сваімі рукамі ўсё вырабім...

Нібы пра нас, палешукоў, сказана. Паляшук заўсёды спадзяваўся на сябе і шмат працаваў. Так і цяпер робяць нашы людзі, шчыруюць на зямлі, атрымліваюць ураджаі, прадаюць вырашчанае і будуюць планы на будучыню. «Хто працуе, той і мае» — на Палессі любяць гэтую прыказку, паводле яе мудрасці і жывуць. А яшчэ для палешука гонар быць патрыётам сваёй краіны, шанаваць і малую, і вялікую Радзіму. Паляшук заўсёды трымаўся сваёй зямлі, а зямля і радзіма — паняцці роднасныя. Ну і, вядома, людзі цэняць спакой на зямлі як найпершую ўмову плённай і стваральнай працы.

Руслан ВІНАКУРАЎ, дэпутат Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, дырэктар Віцебскага дзяржаўнага політэхнічнага прафесійнага ліцэя:

— «Вялікая размова» насамрэч вельмі важнае мерапрыемства для краіны, таму што падчас яго кіраўнік дзяржавы шчыра адказваў на ўсе пытанні, якія задавалі прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі і іншыя запрошаныя.

І для мяне як для кіраўніка ўстановы адукацыі «Вялікая размова» — вельмі важная падзея, таму што ў ліку іншых былі агучаны пытанні наконт моладзі, адукацыі. Акрэсліваліся шляхі развіцця краіны на найбліжэйшую перспектыву.

Для сябе я адзначыў вельмі шмат важнага. У прыватнасці, трэба далей актывізаваць работу па патрыятычным выхаванні моладзі. Неабходна ствараць умовы дзеля таго, каб наша моладзь была запатрабаванай на рынку працы, самае галоўнае для ўстановы адукацыі — рыхтаваць якасных і кваліфікаваных спецыялістаў. Пры гэтым, безумоўна, важна раскрываць здольнасці, якія ёсць у хлопцаў і дзяўчат.

На сёння можна з упэўненасцю казаць, што добрая матэрыяльна-тэхнічная база ў нас ёсць. Таму застаецца толькі, каб была якасная і згуртаваная работа педагагічнага калектыву, выкладчыкаў, майстроў, каб насамрэч нашы дзеці пасля атрымання дыплома адпавядалі патрабаванням часу і былі патрыётамі сваёй Радзімы.

Андрэй СЫЧ, палітолаг:

«Лукашэнка стаміўся», — казалі яны. «Лукашэнка ўжо не вывозіць», — пісалі яны. «Лукашэнка аслабеў», — думалі яны. «Вялікая размова з Прэзідэнтам» прайшла на адным дыханні — кіраўнік дзяржавы ўтрымліваў цікавасць да гутаркі больш за восем гадзін і адказаў на ўсе пытанні, што хвалююць грамадства. Фактычна была пастаўлена кропка ў спробе дзяржаўнага пераварот. Вызначаны і, не менш важна, апублікаваны ўсе алгарытмы, па якіх дзейнічалі нашы апаненты падчас экспансіі. Важна і тое, што беларускі досвед паказвае, — можна паспяхова супрацьстаяць тэхналогіям каляровых рэвалюцый. Нашай гісторыяй поспеху пачалі карыстацца ў іншых краінах. Так, на Кубе падчас пратэстаў адным з лозунгаў стала правядзенне паралеляў з Рэспублікай Беларусь. Умоўна: «Яны змаглі выстаяць, і мы выстаім». На мой погляд, падчас «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» прагучаў вельмі важны тэзіс. Ён датычыўся тых, хто выходзіў на вуліцу пратэставаць: Аляксандр Лукашэнка гатовы змагацца за кожнага беларуса і не лічыць іх ворагамі.

Лілія НАВІЦКАЯ, галоўны рэдактар абласнога ўнітарнага інфармацыйна-рэкламнага прадпрыемства «Рэдакцыя газеты «Гродзенская праўда».

«Вялікая размова з Прэзідэнтам» прайшла літаральна на адным дыханні. Прагучала прыкладна чатыры дзясяткі пытанняў ад беларускіх і замежных журналістаў. Яны былі самыя розныя, часам дыяметральна супрацьлеглыя.

Заўважыла, што запрошаныя на сустрэчу журналісты з Польшчы, Літвы, Украіны, ЗША, Вялікабрытаніі задавалі пытанні, быццам усе атрымалі напярэдадні заданне адной вельмі негатыўна скіраванай на нашу краіну рэдакцыі. У іх пытаннях гучалі такія нагнаўшыя аскому фразы, як «мірныя пратэсты», «жорсткія катаванні» і таму падобнае, што не мае ніякіх адносін да рэальнасці. Дзяўчаты з англійскіх і амерыканскіх СМІ ўставалі і чыталі з паперак адны і тыя ж словы, быццам не чулі папярэднія пытанні, паўтараючы адна адну. Магчыма, такая была іх задумка. І калі прагучала падобнае пытанне ў трэці раз, на якое ўжо быў дадзены грунтоўны адказ, у зале пракацілася хваля абурэння, настолькі была відавочная прадузятасць калег з гэтых выданняў. Падумалася, што гэта ўжо не жнівень 2020-га, што цяпер, ідучы на такое мерапрыемства, варта было б вывучыць тэму больш глыбока і прафесійна. Калі Прэзідэнт прапанаваў падмацаваць абвінавачанне фактамі, нічога канкрэтнага дзяўчаты-журналісткі сказаць не маглі. Патрабаванне выкласці факты паставіла іх у тупік. Пры гэтым прадстаўніца аднаго з амерыканскіх каналаў папрасіла Аляксандра Лукашэнку аб інтэрв'ю. Ён пагадзіўся, але з адной умовай — каб яно выйшла без купюр, без скарачэнняў, без вырваных з кантэксту фраз. Усе пытанні і ўсе адказы. І што ж? Ніякага выразнага адказу на такую прапанову Прэзідэнта так і не пачулі.

Шчыра кажучы, вытрымка Аляксандра Рыгоравіча, з якой ён адказваў на любыя, нават самыя несправядлівыя, пытанні, уразіла. Трэба сказаць, што нашы сталічныя калегі, якія працавалі падчас вулічных акцый і працягваюць тэму, самі давалі адпор замежным журналістам і прапаноўвалі паглядзець відэа, зробленыя ў той час на тэлефон, дзе выразна бачная агрэсія «мірнага пратэсту»... Галоўнае пачуццё пасля «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» — упэўненасць у тым, што мы справіліся з выклікамі і справімся з імі ў будучым.

Нэлі ЗІГУЛЯ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Маргарыта УШКЕВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ.

З першымі чатырма тысячамі!

І ГЭТА — НЕ МЯЖА

Бялыніцкі СВК «Калгас «Радзіма» першы ў Магілёўскай вобласці завяршыў уборачную кампанію

З такой нагоды гаспадарку наведаў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.

Фота БелТА.

Ён павіншаваў легендарнага кіраўніка калгаса Аляксандра Лапацентава і яго працоўны калектыў з гэтай значнай падзеяй і добрымі вынікамі.

— Вы не проста вырасцілі хлеб, але і ўклалі ў яго сваю душу, — падкрэсліў ён. — Атрымаўся нядрэнны па цяперашніх мерках каравай пры сярэдняй ураджайнасці звыш 50 цэнтнераў з гектара.

Усяго на тэрыторыі гаспадаркі ўбрана 17,5 тысячы тон збожжавых і зернебабовых культур. Шчырыя віншаванні і падарункі атрымаў першы ў вобласці і краіне экіпаж-чатырохтысячнік у складзе Мікалая Дарэчкіна і Канстанціна Саладухі *(на фота)*. Другі вынік — звыш 3000 тон намалоту — таксама на рахунку гэтай аграгаспадаркі. Яго паказалі камбайнеры Ігар Шчолухаў і Віктар Васільеў.

Мікалай Дарэчкін, які не ўпершыню становіцца лідарам жніва, прадстаўляў гаспадарку ў лютым гэтага года на Усебеларускім народным сходзе. Ён казаў пра тое, што сёння ў краіне створаны ўсе ўмовы для таго, каб сябе рэалізаваць. Адзінае, што патрабуецца ад чалавека, гэта дастойна працаваць. Толькі ад гэтага залежыць і дабрабыт асобна ўзятага грамадзяніна, і краіны ў цэлым. Падчас сёлетняй уборачнай Мікалай на справе паказаў, як павінен працаваць кожны на сваім месцы.

— Спадзяюся, што чатыры тысячы — не апошні наш вынік, будзем рабіць усё, каб падняцца на прыступку ў пяць тысяч, — падзяліўся планамі з карэспандэнтам «Звязды» Мікалай Дарэчкін. — Надвор'е дазваляе весці ўборачную паскоранымі тэмпамі. Працаваць прыходзіцца шмат. У полі праводзілі час з шасці раніцы да адзінаццаці вечара. Цяпер мы дапамагаем суседняй гаспадарцы ў Бялыніцкім раёне. Сёлетні ўраджай добры, але крыху меншы, чым быў летась. Зімой падмарозіла азімыя, а летам быў засушлівы перыяд.

Па інфармацыі абласнога прафсаюза работнікаў АПК, на раніцу 10 жніўня ў Магілёўскай вобласці сабраны ўраджай на 68 % (летась было 50 %) пасяўных плошчаў (226 718 гектараў). Сабраны ўраджай у памеры 686 956 тон пры сярэдняй ураджайнасці 30,3 ц/г. Экіпаж камбайнераў у складзе Мікалая Дарэчкіна і Канстанціна Саладухі працягвае лідзіраваць у маштабах краіны. На раніцу 10 жніўня яны намалацілі 4 126,5 тон зерня.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

З нагоды

Свята нацыянальнага слова

Як ідзе падрыхтоўка да Дня беларускага пісьменства

Свята, якое адзначаюць усе аматары беларускага прыгожага слова, пройдзе 4-5 верасня. Сёлета Дзень беларускага пісьменства будзе адзначацца ў Капылі — мястэчку, якое стала малой радзімай для вялікай колькасці культурных дзеячаў. На прэс-канферэнцыі «Адзінства беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай краіны» распавялі аб тым, якія этапы падрыхтоўкі ўжо пройдзены, і чаго нам чакаць у выніку.

— Першае, пра што хацелася б сказаць, — гэта канцэпцыя свята. Асноўнай тэмай стаў Год народнага адзінства, — звярнуў увагу **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ.** — Гэта можна будзе ўбачыць як на ўзроўні прадстаўленых кніг, так і на ўзроўні прэзентаваных праектаў. Адзначу, што падчас арганізацыі мерапрыемстваў мы імкнуліся адлюстраваць знакавыя для краіны падзеі, аб'яднаныя пісьменніцкім словам. Гэта 80-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны і гісторыка-культурная спадчына Капыльшчыны. Традыцыйна Дзень беларускага пісьменства пачнецца з рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Шлях да святыняў».

Плануецца, што падчас правядзення свята арганізуюць шэраг пляцовак: асноўная будзе прадстаўлена пад назвай «Адзінства». **Гісторык, калекцыянер, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ** распавёў аб цэнтральнай пляцоўцы:

— Сумесна з Міністэрствам інфармацыі і Нацыянальным гістарычным музеем рыхтуецца вялікая выстаўка. У Капылі будуць прадэманстраваныя ўнікальныя артэфакты, звязаныя з аб'яднаннем беларускага народа, напрыклад, газеты, якія выдаваліся ў Заходняй Беларусі ў 1921—1939-я гады.

Кожны з наведвальнікаў зможа захаваць кавалачак гісторыі: арганізатары абяцаюць надрукаваць калажы з фрагментамі заходнебеларускіх газет.

Дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Іван САВЕРЧАНКА нагадаў аб літаратурнай прэміі, якая традыцыйна ўручаецца ў Дзень беларускага пісьменства:

— Нацыянальная літаратурная прэмія — гэта вельмі важны стымул для развіцця літаратуры. Саюзам пісьменнікаў Беларусі ды выдавецтвамі было вылучана звыш шасцідзесяці работ. Цікава, што сёлета ўдзел узялі не толькі пісьменнікі, але і грамадскія дзеячы. Мне падаецца, што пераможцы — вельмі яркія творчыя асобы з выдатнымі літаратурнымі творамі.

Нагадаем, што прэмія мае сем намінацый: проза, паэзія, публіцыстыка, драматургія, дзіцячая літаратура і дэбют. Імёны пераможцаў стануць вядомыя на свяце.

Арганізатары запрасілі ўсіх жадаючых наведаць Капыль, а таксама параілі не звяртаць увагі на колькасць кіламетраў, што прыйдзецца праехаць, калі вы жывяце ў іншай вобласці: яркія ўражанні, якія ўдасца атрымаць на свяце, вартыя доўгага шляху.

Арына КАРПОВІЧ.

Памятны канверт да свята

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпускае ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «Дзень беларускага пісьменства».

Яго мастаком, як і спецштэмпеля, стала Таццяна Дольская, дызайн — Марыны Віткоўскай. Намінал маркі «А» адпавядае тарыфу на перасылку простага ліста масай да 20 грамаў уключна ў межах Беларусі.

Спецыяльнае памятнае гашэнне пройдзе 5 верасня ў аддзяленні паштовай сувязі № 2 Капыля, які сёлета прымае XXVIII Дзень беларускага пісьменства.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Шок

Літоўцы кінулі на граніцы цяжарную жанчыну без прытомнасці

Інцыдэнты на беларуска-літоўскай граніцы на гэтым тыдні не спыняюцца. У панядзелак нашы пагранічнікі зафіксавалі выпадак негуманнага абыходжання літоўскага боку з замежнікамі, якія шукаюць прыстанішча ў краінах Еўрасаюза. Пра гэта БелТА паведаміў афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Антон БЫЧКОЎСКІ.

— Для Літвы стала нармальнай практыкай арганізавана дастаўляць групы замежнікаў да беларускай граніцы, затым пакідаць іх там без неабходнай меддапамогі, вады, ежы і цёплых рэчаў. Так, на ўчастку пагранічнага паста «Клявіца» Смаргонскай пагранічнай групы назіралася група з 32 чалавек. Па словах замежнікаў, на тэрыторыі Літвы яны былі затрыманыя пагранічнікамі, якія прывезлі іх да граніцы, а затым з ужываннем фізічнай сілы, пад пагрозай зброі сілком выправадзілі на лінію граніцы, нягледзячы на тое, што ўсе яны адкрыта заяўлялі аб жаданні атрымаць статус бежанца, — распавёў Антон Бычкоўскі. Паводле яго слоў, прадстаўнікі літоўскай пагранічнай службы, убачыўшы нарад з беларускага боку, перачакалі некаторы час і забралі частку групы мігрантаў.

На ўчастку пагранічнага паста «Палессе» Смаргонскай пагранічнай групы ўчора была выяўлена чарговая група з 10 чалавек, у тым ліку трое дзяцей. Усе яны былі гвалтоўна выдвараны літоўскім бокам на лінію літоўска-беларускай граніцы. Пра гэта паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце.

«Іншаземец з гэтай групы зафіксаваў на відэа абуральны факт дзеяння прадстаўнікоў літоўскай пагранічнай аховы, якія супярэчаць усім законам і чалавечым каштоўнасцям. На кадрах выразна відаць, як літоўскія пагранічнікі перамяшчаюць цяжарную жанчыну без прытомнасці з літоўскага боку на лінію граніцы і пакідаюць яе там. Гэта не што іншае, як наўмыснае пакіданне чалавека ў небяспецы без магчымасці атрымання неабходнай медыцынскай дапамогі», — распавялі ў ДПК.

Органамі пагранічнай службы замежніцы на месцы аказана першая дапамога. Іншаземка ў цяжкім стане дастаўлена ў Пастаўскую цэнтральную бальніцу. У пацярпелай ёсць у тым ліку прыкметы знясілення. Акрамя таго, у Літве з ёй знаходзіліся трое дзяцей, якія таксама былі дастаўлены ў медустанову для агляду.

— Мяркуем, што Літва прытрымліваецца тактыкі мэтанакіраванай транспарціроўкі груп бежанцаў з аднаго ўчастка на другі. Цяпер дзеянні сумежнага боку накіраваныя выключна на ўтойванне фактаў неправамернага выправаджвання замежнікаў, якія імкнуцца ў Еўрасаюз, — адзначылі ў ДПК. — Падкрэсліваем, што на сённяшні дзень ніводная міжнародная арганізацыя, якая мае прадстаўніцтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, не накіроўвала сваіх спецыялістаў для высвятлення сітуацыі на літоўска-беларускай граніцы. Гэта датычыцца як праваабарончых, так і гуманітарных арганізацый. З іх боку адсутнічае ініцыятыва па аказанні прававой кансультацыі замежным грамадзянам, якія імкнуцца атрымаць прыстанішча ў краінах Еўропы, а таксама іншай дапамогі ў рамках выканання сваіх абавязацельстваў.

Пётр ДУНЬКО.

• Даслоўна

Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ:

— Сістэма абароны Дзяржаўнай граніцы забяспечвае абарону нашай краіны ад замахаў звонку. Тыя факты, якія, на жаль, адбываюцца на літоўскай, польскай граніцы, не робяць гонару нашым калегам, нашым суседзям. Вось свежы выпадак: літоўскія пагранічнікі вынеслі цяжарную жанчыну, проста кінулі яе і сышлі. Якія дэмакратычныя каштоўнасці? Якая мараль? Гэта не ўкладваецца ні ў якія рамкі. Вядома, беларускія пагранічнікі не кінуць чалавека паміраць. Медыцынская дапамога ўжо аказана. Гэта проста па-за мараллю беларускага чалавека, — заўважыў Аляксандр Вальфовіч.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Урад Афганістана пачаў перагаворы з талібамі

У Досе, сталіцы Катара, стартавалі перагаворы паміж урадам Афганістана з рухам «Талібан». Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на крыніцу ў афганскім міністэрстве па пытаннях міру. Стала вядома, што перагаворы працягнуцца тры дні. Афганскі ўрад на іх будуць прадстаўляць кіраўнік афганскага Вышэйшага савета па нацыянальным прымірэнні Абдула Абдула, былы кіраўнік нацыянальнага дырэктарата бяспекі Афганістана (NDS) Масум Станекзай і міністр па пытаннях міру Саед Садат Мансур Надзяры. Кабул быў вымушаны пайсці на перагаворы з талібамі з-за імклівага наступлення баевікоў. За апошнія некалькі дзён «Талібан» захапіў шэсць сталіц афганскіх правінцый. Горад Айбак — сталіца правінцыі Саманган — здаўся талібам без бою.

Прэм'ер Грэцыі папрасіў прабачэння ў грамадзян за сітуацыю з пажарамі

Грэцыя перажывае стыхійнае бедства беспрэцэдэнтных маштабаў — 586 пажараў успыхнула на працягу некалькіх дзён у розных раёнах краіны. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Кірыякас Міцатакіс у звароце да нацыі, які трансляваў дзяржаўны тэлеканал ERT1. «Апошнія дні былі аднымі з самых цяжкіх для нашай краіны за апошнія дзесяцігоддзі. Мы змагаліся і працягваем змагацца [з агнём] з усіх сіл. Пажары, што ўзніклі з-за беспрэцэдэнтнай спёкі і доўгіх месяцаў засухі, цяпер вельмі цяжка патушыць», — сказаў Міцатакіс. Ён падзякаваў краінам, якія прапанавалі сваю дапамогу ў барацьбе з прыроднымі пажарамі. Кіраўнік урада падкрэсліў, што маштабы катастрофы, асабліва на востраве Эўбея і ў цэнтральнай вобласці Атыка, «азмрочваюць сэрцы ўсіх». «І я першы прашу прабачэння за ўсе праблемы, якія мелі месца», — сказаў Міцатакіс.

РАТАВАЛЬНІКІ НА ЖНІВЕ

УБОРАЧНАЯ ЗАМЕСТ АДПАЧЫНКУ

Руль пажарнага аўтамабіля на руль камбайна на час свайго адпачынку памяняў і Іван Худы. Кіроўца пажарнага аварыйна-ратавальнага паста № 11 вёскі Занарач, што на Мядзельшчыне, ужо шосты год удзельнічае ва ўборачнай кампаніі. Ратавальнікам малады чалавек працуе ўсяго тры гады, але кожны свой адпачынак ён праводзіць не на курорце і нават не каля вясковага вадаёма, а на палях ААТ «Занарачанскі» — Іван лічыць за гонар унесці свой уклад у агульны каравай.

Супрацоўнік МНС нарадзіўся ў вёсцы, таму не па чутках ведае, што такое жніво. У мясцовую гаспадарку малады чалавек прыйшоў пасля арміі, тут жа ўладкаваўся на пажарны пост. З'яўляючыся супрацоўнікам раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, ён ніколі не забываў пра сельскагаспадарчыя справы.

Пажарны Ілья ПЯЛЮГІН заўжды марыў паўдзельнічаць ва ўборцы ўраджаю.

— Работа на камбайне вельмі складаная, з самай раніцы да позняга вечара, — прызнаецца Іван Худы. — Кожны камбайнер адчувае адказнасць, таму імкнецца выконваць свае задачы добрасумленна. А па-іншаму і не атрымліваецца! Падчас уборкі галоўнае, каб тэхніка не ламалася, надвор'е не падводзіла і каб не адбывалася ніякіх пазаштатных сітуацый. З гэтай прычыны штодзень правяраю першасныя сродкі пажаратушэння, ачышчаю камбайн ад саломістай масы, бо разумею, якія сляды пакідае пасля сябе агонь, якія матэрыяльныя затраты нясе сельскагаспадарчае прадпрыемства і дзяржава ў цэлым. А так хочацца, каб на стале ў беларусаў кожны дзень з'яўляўся свежы хлеб.

Дзеля ўборачнай кампаніі ахвяраваў сваім адпачынкам і супрацоўнік пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 1 у Стоўбцах Ілья Пялюгін. Малады чалавек — памочнік камбайнера ў прыватным прадпрыемстве «Профі-Агрэцэнтр».

— Кожны год у перыяд уборачнай кампаніі наша тэхніка дзяжурыць у палях, забяспечваючы прыкрыццё машынам, якія працуюць, — гаворыць Ілья Пялюгін. — І мы добра бачым, колькі працы, сіл, цярпення патрэбна, каб своечасова сабраць ураджай. Часта мне хацелася падысці, дапамагчы. А сёлета нават з'явілася магчымасць прыняць удзел ва ўборцы.

НЕ ДАПУСЦІЦЬ ПАЖАРУ

Галоўная задача ратавальнікаў падчас жніва — не дапусціць пажару, а калі ўзгаранне ўсё ж адбылося, аператыўна яго ліквідаваць. Невыпадкова да ўборачнай кампаніі супрацоўнікі МНС рыхтуюцца загадзя. Разам з кіраўнікамі прадпрыемстваў і гаспадарак праводзяць работу па падрыхтоўцы месцаў захоўвання ўраджаю: гэта датычыцца і збожжавых культур, і грубых кармоў. Акрамя таго, правяраюцца агрэгаты, задзейнічаныя ва ўборачнай кампаніі: зернесушыльныя комплексы, тэхніка.

— Разам з мерапрыемствамі нагляду, якія мы штодзённа ажыццяўляем падчас жніва, у перыяд уборачнай кампаніі таксама адбываецца абследаванне аб'ектаў, для аграрыяў праводзяцца інструктажы, — адзначае **першы намеснік начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Уладзімір ЯНЧЫК.** — Ва ўсе гады мы разам з кіраўнікамі гаспадарак рабілі ўсё, што ад нас залежыць, каб стварыць на жніве бяспечныя ўмовы і захаваць ураджай — як на стадыі ўборкі, так і падчас яго захоўвання.

Такая ўвага з боку ратавальнікаў тлумачыцца тым, што работа на жніве з'яўляецца пажаранебяспечнай. Узмацняецца катроль на палях асабліва тады, калі стаіць сухое надвор'е. Нягледзячы на тое што ва ўборачнай кампаніі задзейнічана тэхніка гаспадарак, прадугледжаная на выпадак тушэння агню, штодзённа на палі выязджае да 120 адзінак тэхнікі і каля 300 супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. І гэта толькі ў Мінскай вобласці!

ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР

За перыяд сёлетняй уборачнай кампаніі на аб'ектах сельскагаспадарчай вытворчасці цэнтральнага рэгіёна краіны зарэгістравана дзевяць пажараў. У асноўным, гэта ўзгаранні сухога ржышча, саломы. Зафіксаваныя і факты ўзгарання збожжавых на корані. У прыватнасці, днямі ратавальнікам паступіла паведамленне аб тым, што ў Пухавіцкім раёне гарыць поле. Супрацоўнікі МНС, якія аператыўна прыбылі на месца, устанавілі, што на момант узнікнення пажару ў полі ішло жніво. Тушэнне агню да прыбыцця спецыялістаў не ажыццяўлялася. Ратавальнікі з вогненнай стыхіяй справіліся хутка. Сельскагаспадарчае прадпрыемства выдзеліла сваю тэхніку. Пацярпелых не было. Агонь знішчыў сем гектараў ячменю на корані. Аднак калі б пажарныя своечасова не падаспелі на дапамогу, маштабы трагедыі маглі быць большыя — да 70 гектараў.

Дзякуючы ім у Маладзечанскім раёне было выратавана звыш 430 тон сена. Узгаранне сенасклада на тэрыторыі малочнатаварнай фермы паблізу вёскі Насілава адбылося на світанні ў канцы ліпеня. Падраздзяленні МНС, якія прыбылі на месца здарэння, устанавілі, што сена гарыць унутры склада. У ліквідацыі пажару ўдзельнічала і тэхніка гаспадаркі. Агнём былі знішчаны тры тоны грубага корму.



Супрацоўнікі МНС клапоцяцца аб тым, каб не дапусціць пажару на палетках.

Зноў жа, калі б не аператыўнае рэагаванне ратавальнікаў, маштаб пажару на полі каля вёскі Ельніца мог быць значна большы: іржышча гарэла на плошчы амаль у тры гектары. Прычына — узгаранне тэхнікі пры правядзенні работ па прасоўцы саломы. У выніку агнём была пашкоджана электраправодка прэс-падборшчыка і 25 рулонаў саломы. Пацярпелых няма.

— Асноўная прычына большасці пажараў на палетках звязана з чалавечым фактарам, — канстатуе Уладзімір Янчык. — На жаль, у большасці ўзгаранняў, якія сёння адбываюцца на аб'ектах сельскагаспадарчага профілю, вінаватыя людзі. Існуе яшчэ і тэхнічная прычына, якая сёлета найбольш ярка сябе праявіла. Калі стаяла спёка, пажнёўныя рэшткі былі настолькі сухія, што нават самай маленькай іскры, якая ўзнікае пры пападанні каменя на металічныя прадметы, хапіла для ўзгарання. Толькі дзякуючы таму, што на полі дзяжурыла тэхніка МНС, знаходзіліся праінструктаваныя людзі, у гэтую ўборачную кампанію ў нас не было дапушчана пажараў на вялікай плошчы. Усе ўзгаранні ліквідаваліся на пачатковай стадыі.

Бывае, што работы ратавальнікам дадаюць мясцовыя жыхары, якія паляць каля палёў са збожжам смецце. Аднак калі асобу такога чалавека ўстанавіць нескладана, то амаль немагчыма вызначыць таго, хто, ідучы або праязджаючы каля палеткаў на машыне, выкінуў праз акно непатушаную цыгарэту. У такім выпадку падключаюцца органы ўнутраных спраў. Надоечы ў Капыльскім раёне праваахоўнікі ўвогуле выйшлі на таго, хто наўмысна падпаліў сцірту саломы. Адказнасць за падобны ўчынак вінаваты панясе немалую.

Вераніка КАНЮТА.
Фота з архіва Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сімвал і гонар

ЛЁН — ГЭТА РОДНАЕ, НАША...

Дзе ў Беларусі ствараюць сапраўдны брэнд лёну? За званне беларускай ільняной сталіцы гатовая паспрачацца Карма. Фестываль «Ільняная карусель» у пяты раз заклікаў у райцэнтр, што на паўночным усходзе Гомельшчыны, усіх, хто цікавіцца гісторыяй «паўночнага шоўку», шануе і любіць нацыянальную самабытную культуру.

Сапраўды, не так шмат райцэнтраў можа пахваліцца рэгіянальнымі святамі і фестывалямі, вядомымі і папулярнымі ва ўсёй краіне. Упершыню «Ільняная карусель» закруцілася ў невялікім гарадскім пасёлку ў 2017 годзе. Свята прайшло з поспехам, зарадзілася фестывальная традыцыя. Ды як жа інакш? Лён на Кармянчыне — сімвал і гонар раёна: амаль палова пасяўных плошчаў тут адведзена менавіта пад гэтую культуру, наладжана льнаперапрацоўка. У раёне актыўна працуюць над культурным складнікам папулярызацыі лёну, займаюцца вырабам рознай ільнопрадукцыі, заахвочваюць рамеснікаў. У сваю чаргу, развіццё льнянога брэнда пазітыўна адбіваецца на эканамічным становішчы раёна.

— Для Кармы гэта не проста брэнд, — адзначыў падчас адкрыцця фестывалю **старшыня Кармянскага райвыканкама Андрэй ТУРУК**. — Гэта работа для людзей, для многіх-многіх соцень сем'яў добры прыбытак. Сёлета мы вельмі сур'ёзна ўклаліся ў вытворчасць лёну. Але гэтыя выдаткі акупяцца нават не ў разы, а ў дзясяткі разоў. І самае галоўнае — дастатак для нашых жыхароў.

Сёлета «Ільняная карусель» красуецца ў цэнтральным парку і на галоўнай плошчы гарпасёлка. Фестываль распачало тэатралізаванае прадстаўленне з дэфіле ў строях з «паўночнага шоўку», далей былі прывітанні афіцыйных гасцей, канцэрт і ўзнагароджанне фальклорных калектываў. Акрамя таго, да свята ў раёне прымеркавалі цырымонію ўшанавання ветэранаў працы Кармянскага льнозавода, маладых сужэнцаў, якія адзначаюць сёлета «льняное вяселле», і віншаванне дзяцей-аднагодкаў фестывалю.

Традыцыйна папулярны сярод гасцей свята горад ільномайстроў з яго інтэрактыўнымі пляцоўкамі і майстар-класамі. Рамеснікі дэманстравалі гатовыя вырабы і аксесуары з лёну і прапанавалі ўсім жадаючым зрабіць сувенір сваімі рукамі. Наведвальнікі імпрэзы атрымалі магчымасць паўдзельнічаць у стварэнні «льняной каруселі» — кампазіцыі з рушнікоў, вышытых традыцыйнымі кармянскімі ўзорамі.

— Лета гэтага года паказала, як можа быць горача, а выглядаць хочацца добра. І вось лён дазваляе вам выглядаць шыкоўна і пры гэтым не адчуваць на сабе адзення. Лён — гэта экалагічна, гэта лёгка, гэта эстэтычна. І наогул, гэта наш родны матэрыял — сімвал нашай роднай краіны, — натхняе на фестывалі ўпусціць лён не толькі ў сваё штодзённае жыццё, але і ў сэрцы майстрыха Вольга Ачарэтная.

Штогод на фестывалі не стамляецца зараджаць любоўю да льну і вядомая на Кармяншчыне майстрыха Таццяна Суглоб. Яе вобраз у народным строі — даніна павагі да роднага краю і яго традыцый.

— Вы самі ўбачце: ідзяце вы па выстаўцы — адразу ў вочы кідаюцца нашы рушнікі? Дзе б мы ні былі, заўсёды яны прыцягваюць увагу, людзі падыходзяць. Хтосьці цікавіцца — маўляў, прыгожа, а хтосьці купляе. На падарунак. Калі едзеце за мяжу, гэта наогул шыкоўны падарунак. Ручная работа. Маляўніча, прыгожа, ярка, — дзеліцца майстрыха.

Акрамя атмасферных ільняной эстэтыкі, фестываль у чарговы раз здзіўляў гастранамічнай разнастайнасцю. На падворках «Ільняной карчмы» можна было пакаштаваць і купіць стравы на самыя розныя густы. Забаўляльную праграму забяспечылі інтэрактыўныя пляцоўкі са спартыўнымі гульнямі і беларускімі народнымі забавамі. Творчыя выступленні калектываў раёна, вобласці і гасцей фестываль аб'яднаў агульнай «ільняной» тэмай — народнымі песнямі і матывамі аб гэтай культуры і майстрах яе апрацоўкі.

У планах арганізатараў наступную «Ільняную карусель» на Кармяншчыне зрабіць ужо міжнародным фэстам.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота БелТА.

ЗРАБІЦЬ ВЫСНОВЫ І ІСЦІ ДАЛЕЙ

Гульні XXXII Алімпіяды — ужо гісторыя, але, вядома, памятаць іх будуць доўга. У медальным заліку Алімпійскіх гульняў у Токіа беларусы размясціліся на 44-й пазіцыі, маючы ў сваёй скарбонцы сем медалёў. Зафіксуем самыя важныя алімпійскія падзеі.

ЗАЛАТЫ ПАЛЁТ ІВАНА ЛІТВІНОВІЧА

Першы алімпійскі тыдзень аматары беларускіх спартсменаў з заміраннем сэрца чакалі першага медаля. Таму залаты медаль Івана Літвіновіча ў скачках на батуце стаў сапраўдным святам, хоць такога поспеху ўсе чакалі ад чэмпіёна Гульняў 2016 года Уладзіслава Ганчарова. Тады ў Рыа беларус стварыў сенсацыю, перамогшы кітайскага саперніка Дун Дуна, які лічыўся фаварытам турніру. Праз пяць гадоў у Токіа сітуацыя паўтарылася, толькі галоўны герой быў іншы. Іван Літвіновіч, выступаючы апошнім, атрымаў ад суддзяў 61,715 бала і стаў алімпійскім чэмпіёнам. Другое месца заняў кітаец Дун Дун. А Уладзіслаў Ганчароў размясціўся на чацвёртым месцы пратакола.

«Ці самы шчаслівы дзень для мяне сёння? Не! Напэўна, такім з'яўляецца той, калі я прыйшоў у залу да Вольгі Анатолеўны Уласавай. Што ж датычыцца фіналу, вельмі хваляваўся. Узлятаў — і разумеў: памылак быць не павінна», — дзяліўся потым Іван з журналістамі.

«БРОНЗА» З ЗАЛАТЫМ АДЛІВАМ

Калі перамога Івана Літвіновіча стала ў пэўнай ступені сюрпрызам, то ад Максіма Недасекава медаль чакалі. І гэта было зусім не дзіўна. У пачатку ліпеня яму скарылася вышыня ў 2 м 37 см, што стала новым нацыянальным рэкордам. Для параўнання, «залаты» вынік Аліміяды ў Рыа — 2 м 38 см, «сярэбраны» — 2 м 36 см. І менавіта гэтая вышыня прынесла яму званне бронзавага прызёра Алімпійскіх гульняў.

У сектары для скачкоў у вышыню Максім і яго калегі якасна забяспечылі журналістаў інфармацыйнымі нагодамі. Па-першае, беспрэцэдэнтны выпадак, калі «залатымі» чэмпіёнамі сталі адразу два спартсмены: італьянец Джанмарка Тамберы і катарац Мутаз Эса Баршым паказалі аднолькавую колькасць паспяховых спроб, у чым і пераўзышлі беларуса. Арганізатары прапанавалі ім выканаць яшчэ адну спробу і высветліць, хто ж наймацнейшы. Але тыя адмовіліся. «Серабро» не ўручалася, а «бронза» дасталася Максіму Недасекаву.

Па-другое, і «залаты» і «бронзавы» вынік гэтых спаборніцтваў — аднолькавыя. Італьянец, катарац і беларус скокнулі 2 м 37 см. Усё вырашыла колькасць аднолькавых спроб. Вышыня 2 м 39 см не скарылася нікому. Сам Максім Недасекаў да гэтага паставіўся па-філасофску, падкрэсліўшы, што ў 23 гады «бронза» Алімпійскіх гульняў — вельмі добры вынік і што ўсё яшчэ наперадзе.

БАРЦОЎСКІ ДЭСАНТ

Тры з сямі медалёў у беларускай скарбонцы належаць барцам. Пачалося ўсё з Ірыны Курачкінай. У фінальным паядынку катэгорыі 57 кілаграмаў Ірына ўступіла японскай спартсменцы Рысака Каваі. І зноў гісторыя паўтарылася — у 2016 годзе на Алімпійскіх гульнях у фінале беларуска Марыя Мамашук прайграла Рысака Каваі і стала сярэбраным прызёрам.

«Псіхалагічна было вельмі цяжка. Гэта былі мае першыя Алімпійскія гульні. Своеасаблівай рэпетыцыяй сталі дамашнія Еўрапейскія гульні, хоць гэта турнір не такога маштабу. Лічу, што ўсё склалася», — расказвала журналістам Ірына, вярнуўшыся ў Мінск.

Калі б пра Ванесу Каладзінскую здымалі

фільм, гэта быў бы трылер. Да Алімпійскіх гульняў у Токіа яна ішла праз хваробу, траўмы, няўдачы і асабістыя перамогі. Не здраздзіла яна сабе і ў японскай сталіцы, прымусіўшы ўсіх панервавацца. Ванеса Каладзінская магла прэтэндаваць і на «золата». Але ў паўфінале за сем секундаў да заканчэння паядынку прапусціла прыём ад кітаянкі Пань і не змагла выйсці ў фінал. У схватцы за «бронзу» яна аказалася мацнейшая за амерыканку Джакару Гвенішу Вінчэсцер.

«Напэўна, справа ў тым, што ў канцы паядынку я задумалася пра час — колькі засталося. Лішняя думка наогул не павінна прысутнічаць. Трэба быць максімальна сканцэнтраванай», — падзялілася Ванеса.

Парадаксальна, што сярэбранаму медалю вольніка Магамедхабіба Кадзімагамедава радаваліся ўсе, акрамя яго самога. У паядынку за чэмпіёнскі тытул у катэгорыі 74 кілаграмаў беларускі барэц уступіў расіяніну Заўрбеку Сідакаву. «Вельмі рады, што выступаю за Беларусь, зарабляю медалі. У мяне ёсць свае прынцыпы і мэты, задачы, да якіх імкнуся. Гэта «золата». Я ехаў па залаты медаль. Таму крыху засмучаны. Можа, крыху пазней усвядомлю, адчую радасць ад гэтага медаля», — дзяліўся Магамедхабіб з журналістамі пасля вяртання ў Мінск.

ПОСПЕХ ПА НАРАСТАЮЧАЙ

У гэту каманду верылі як ні ў якую іншую, і як ад ніякай іншай чакалі медалёў, бо інакш на Алімпійскіх гульнях яны не могуць. Весляры на байдарках і на каноэ ехалі ў Токіа ў статусе фаварытаў і аб'ектаў галоўных медальных надзей. А як інакш, калі амаль з кожнай Алімпіяды тыя вяртаюцца з узнагародамі? Пасля шостага месца Марыны Літвінчук і Вольгі Худзенкі на 500 метраў, трэцяга месца Алены Наздровай у фінале Б, шостага месца Алега Юрэні на дыстанцыі 1000 метраў і іншых зусім немедальных вынікаў беларускіх весляроў закралася падазрэнне, што паспяховая тэндэнцыя скончыцца ў Токіа. Але затым на старт дыстанцыі 500 метраў выйшла легендарная байдарка-чацвёрка. Марына Літвінчук, Вольга Худзенка, Маргарыта Махнева і Надзея Папок прайшлі заключную гонку Гульняў за 1 хв. 36,073 сек. Апярэдзіць беларускі квартэт змаглі толькі тытулаваныя венгеркі на чале з Данутай Козак — 1 хв. 35,073 сек. На Алімпійскіх гульнях у Рыа Маргарыта Махнева, Марына Літвінчук, Вольга Худзенка, Надзея Папок на дыстанцыі 500 метраў заваявалі «бронзу».

«Калі параўноўваць медалі ў Рыа і Токіа — розніца адчувальная. У Бразіліі — трэція, у Японіі — другія. Паміж гэтымі двума стартамі прайшлі цэлыя пяць гадоў. Усімі праведзена тытанічная работа. А да Парыжа ўжо не так і далёка. Хто ведае, можа, і атрымаецца падняцца яшчэ на адну прыступку», — падзялілася ўражаннямі Марына Літвінчук.

БРОНЗАВАЯ СЕНСАЦЫЯ

Звычайна адтуль, адкуль не чакалі, прыходзіць бяда. Але, на шчасце, у Токіа было інакш. Ад гімнасткі Аліны Гарнасько, шчыра кажучы, мала хто чакаў алімпійскага медаля. Але насуперак усяму яна, набраўшы ў суме індывідуальнага мнагабор'я 102,700 бала, заняла трэцюю прыступку п'едэстала. Аліна паўтарыла поспех у індывідуальным мнагабор'і Юліі Раскінай, Іны Жукавай (абедзве — «серебаро») і Любові Чаркашынай («бронза»), якія станавіліся прызёрамі Алімпіяды ў суверэнны перыяд беларускай гісторыі. У 2021 годзе на алімпійскім п'едэстале — зноў беларуска.

І з гэтым п'едэсталам звязаны буйны скандал сёлетніх Алімпійскіх гульняў. Упершыню з 1996 года Расія засталася без «золата» ў мастацкай гімнастыцы. Чэмпіёнкай стала ізраільская спартсменка Ліной Ашрам. На другім месцы — расіянка Дзіна Аверына, якая лічыць сябе пераможніцай. Прэзідэнт Усерасійскай федэрацыі мастацкай гімнастыкі Ірына Вінер назвала такое судзейства сорамам мастацкай гімнастыкі. Галоўная прэтэнзія заключаецца ў тым, што Ліной выпусціла з рук стужку падчас свайго выступлення. Але згодна з правіламі, прынятымі ў 2017 годзе, такая памылка не крытычная. Калі прадмет вярнуўся ў рукі без перамяшчэння гімнасткі, штраф — 0,5 бала, калі для гэтага патрабуецца 1-2 крокі — 0,7 бала. І Ашрам Ліной у гэтыя межы ўклалася. У мастацкай гімнастыцы агульная адзнака складаецца з двух кампанентаў — складанасці цела і складанасці прадмета. Дзіна Аверына аказалася лепшая ў складанасці прадмета, але прайграла па складанасці цела. У выніку — розніца ўсяго 0,15 бала. Акрамя таго, не варта забываць, што мастацкая гімнастыка — суб'ектыўны від спорту і ніколі нельга выключаць чалавечы фактар.

БЕЗ МЕДАЛЁЎ, АЛЕ З ДОБРЫМ ВЫНІКАМ

Не ўсім беларускім спартсменам удалося заваяваць тытул чэмпіёнаў і прызёраў, але многім удалося паказаць добрыя вынікі. Упершыню ў беларускай гісторыі жаночая каманда па стральбе з лука заняла ў алімпійскім фінале чацвёртае месца. Падзякаваць за гэта трэба Карыне Дзёмінскай, Карыне Казлоўскай і Ганне Марусавай. Галоўны трэнер зборнай Кацярына Цімафеева назвала гэты вынік поспехам. Калі мець на ўвазе, што дагэтуль беларуская зборная па стральбе з лука на Алімпіядах не выступала, з ёй цяжка не пагадзіцца.

Вольга Мазуронак у алімпійскім марафоне паказала вынік у 2 гадзіны 29 хвілін 06 секундаў, гэта найлепшы паказчык сярод еўрапейскіх марафонак. А ў выніковым пратаколе яна размясцілася на пятай пазіцыі. Упершыню ў алімпійскі фінал выйшлі беларускія сінхраністкі. Дар'я Кулагіна і Васіліна Хандошка занялі 11-е месца ў спаборніцтвах дуэтаў.

АДВАРОТНЫ БОК АЛІМПІЯДЫ

Алімпійскія гульні — гэта як перамогі, так і паражэнні. У Токіа беларусы зведалі і тое, і іншае. У японскую сталіцу беларускія дзюдаісты ехалі поўныя надзей і настроеныя на рашучую барацьбу. У першым паядынку супраць немца Карла-Рыхарда Мікіта Свірыд не проста прайграў, але і атрымаў сур'ёзную траўму рукі. Марына Слуцкая паспяхова заваршыла першы раўнд, справіўшыся з прадстаўніцай Трынідада і Табага Габрыелай Вуд, але далей саступіла Міджын Хан з Рэспублікі Карэя, падчас паядынку з якой атрымала траўму рукі.

Алімпійскія багі не былі добрыя і да тэнісістаў. Адзін за адным з алімпіяды выляталі топавыя спартсмены. У першым жа крузе прайграла лідар жаночага рэйтынгу аўстралійка Эшлі Барці. У матчы другога круга з алімпійскай дыстанцыі сышла трэцяя ракетка свету Арына Сабаленка. У 1/8 фіналу барацьбу скончыла Наомі Асака, якая запальвала алімпійскі агонь падчас цырымоніі адкрыцця.

Вялікая ўвага была прыцягнутая да вопытных спарстменаў. Для многіх Алімпійскія гульні ў Токіа павінны былі стаць прыгожай кропкай легендарнай кар'еры. Але, як той казаў, хочаш рассмяшыць бога, раскажы яму пра свае планы. На Алімпіядах гэтая прыказка працуе па максімуме. Легендарны малатабоец Іван Ціхан у сваёй найлепшай спробе адправіў снарад на 74 м 57 см і заняў у сваёй групе А 12-е месца. Гэтага выніку аказалася мала для фіналу. Самая вопытная спартсменка беларускай велаканады Таццяна Шаракава на Алімпійскіх гульнях заняла 16 месца ў омніуме. Яе вынік — 36 балаў, а алімпійская чэмпіёнка амерыканка Джэніфер Валентэ набрала 124 балы. Не змагла падняцца на п'эдэстал і Таццяна Драздоўская. Легенда айчыннага параснага спорту ў розных гонках вагалася ў другой дзясятцы пратакола.

Алімпійскія гульні не заканчваюцца цырымоніяй закрыцця, яны не згасаюць разам з алімпійскім агнём. Гэта самая важная праверка і самы важны спартыўны экзамен. Таму рэфлексія, абмеркаванні, урокі Гульняў пасля закрыцця толькі нарастаюць. Падводзіць вынікі Алімпійскіх гульняў — значыць, падводзіць вынікі чатырохгадовай работы і, безумоўна, ставіць мэты і будаваць планы на наступны цыкл.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота БелТА.

ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже ООО «ГУЛИТТРАНС»

(УНП 101418407, г. Минск, ул. Промышленная, д. 4б, каб. 1),

находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

Дата и время проведения торгов: **13 сентября 2021 года**. Начало – 12.00.
Заявки принимаются с 11 августа 2021 года по 09 сентября 2021 года.
Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
Продавец: **ООО «ГУЛИТТРАНС» (УНП 101418407)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

№ лота		Предмет торгов	Начальная цена, рублей без учета НДС	Шаг торгов	Задаток
1		Комплекс объектов недвижимого имущества ООО «ГУЛИТТРАНС», в том числе:	**348 563,00**	5 %	10 %
	1.1	Капитальное строение с инв. № 500/С-56826, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 4Б, площадь – 164,7 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административно-бытовое здание	**207 200,00**		
	1.2	Капитальное строение с инв. № 500/С-56827, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 4Б/1, площадь – 170,1 кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – станция технического обслуживания и ремонта машин	**133 800,00**		
	1.3	Ограждение (забор), 16 м. куб., состоит из 23 бетонных плит, размеры 4 м*2,16 м*8 см	**3 800,00**		
	1.4	Контейнерная АЗС, размеры 2,60 м*2,28 м*4,75 м	**2 575,00**		
	1.5	Диспетчерская, размеры 2,42 м* 3,04 м*2,10 м	**1 188,00**		
		Сведение о земельном участке: кадастровый номер участка – 500000000002007383, расположен по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 4Б, площадь – 0,9280 га, назначение – земельный участок для обслуживания здания специализированного для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), здания административно-хозяйственного. Правообладатель – ООО «ГУЛИТТРАНС» (право аренды)			
2		Нагреватель на отработанном масле Master WA 33	**161,00**	5 %	10 %
3		Сварочный полуавтомат ПДГ-161 «Гефест-1» У3	**79,00**	5 %	10 %
4		Токарно-винторезный станок CV580/1500	**2 184,00**	5 %	10 %
5		Полуприцеп бортовой MAZ 9758 012, цвет – синий, 2002 г/в, кузов Y3M97580020004396, рег. номер 8294 АА-7	**3 070,00**	5 %	10 %
6		Полуприцеп бортовой тентовый Маз 9758 012, цвет – синий, 2001 г/в, кузов Y3M97580010003700, рег. номер 8855 КА	**2 410,00**	5 %	10 %
7		Грузовой специальный самосвал MAZ 551605 230, цвет – белый, 2003 г/в, кузов Y3M55160530000485, рег. номер АК 0256-7	**3 050,00**	5 %	10 %
8		Легковой универсал SKODA OKTAVIA, цвет – серебристый, 2007 г/в, кузов TMBGS61Z782077439, рег. номер 9993 СН-7	**5 980,00**	5 %	10 %

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенного соглашения в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 16.00 **09 сентября 2021 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 09.09.2021 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 19 августа 2021 года на 16-м открытом аукционе проводит 13-й и 15-й открытые повторные аукционы по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
157	Автоцистерна АЦ-8,7-5320 № 1093 на КамАЗ-5320 ш. ХТС532000Н0266304 1987 г. *3 кат. пробег 30617 км*	г. Молодечно, в/ч 04152	20 000,00	4 000,00
178	Грузовой бортовой Урал-43202 ш. 171106 дв. 764036 1991 г. *4 кат. 79235 км*	г. Старые Дороги, в/ч 48668	10 000,00	2 000,00
180	Грузовой бортовой Урал-43202-0011 ш. 085706 дв. 166537 1987 г. *4 кат. 68952 км*	г. Старые Дороги, в/ч 48668	10 000,00	2 000,00
183	Автомобиль МАЗ-5334 с кузовом-фургоном КМ-500 в составе: Автошасси МАЗ-5334 ш. 84402 дв. 752648 1986 г. *4 кат. 37473 км*. Кузов-фургон КМ-500 № б/н 1986 г. *4 кат*.	г. Старые Дороги, в/ч 48668	6 500,00	1 300,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 19 августа 2021 г. в 10.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 16 августа 2021 года.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 19 августа 2021 г. с 9.15 до 10.00.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факсу (017) 319 35 41. Извещение опубликовано на сайте http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by/

Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» № 105 от 5.06.2021, № 121 от 29.06.2021.

БРЕСТСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Предмет торгов – лот:

1) Передвижная компрессорная станция ММЗ-03-ПВ, год выпуска 2011 г., инвентарный номер 913.
2) Машина уборочная Беларус МУ-320, год выпуска 2010 г., регистрационный знак АВ-1 0670.
3) Полуприцеп малогабаритный тракторный ПМТ-330, год выпуска 2010 г., регистрационный знак БУ1107

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	23 500,00	Размер задатка, руб.	2 350,00

Продавец: КУП «БрестОблУкс», 224005, г. Брест, ул. Наганова, 10, тел./факс 80162 35 00 81. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

Аукцион состоится 15 сентября 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 14 сентября 2021 г. до 17.00

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **Государственное предприятие «Слава труду»** (УНП 500056012), 231482, Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Советская, 74а, тел./факс: (01563) 30-1-95, в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Правовой путь».

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **01 сентября 2021 г.** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

Предмет торгов –

зерноочистительно-сушильный комплекс КЗСВ-30 на газу с комплексом хранения зерна емкостью 500 тонн, инв. № 1058.

Местонахождение – Гродненская обл., Дятловский р-н, д. Ненадовичи. Начальная цена предмета торгов – 633 000,00 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 12.08.2021 г. 09.00 по 31.08.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «АП г. Барановичи»

Лот № 1, состав:

1. **Грузовой седельный тягач ДАФ FT XF 105.410,** кузов (рама) № XLRTE47MS0E805161, г. в. – 2008.

2. **Полуприцеп бортовой тентовый Кегель,** кузов (рама) № WK0S0002400107953, г. в. – 2008.

Начальная цена с НДС – 58 396,79 бел. руб.
Задаток – 6 500,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.
Местонахождение: г. Барановичи, ул. Тельмана, 102-2.

Аукцион состоится 30.08.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков – 26.08.2021 в 11.00.

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Продавец	**ЗАО «АТЛАНТ», г. Минск, пр-т Победителей, 61**
Предмет аукциона – оборудование (бывшее в употреблении), реализуемое одним лотом, по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Наконечникова, 50:	
1. Машина формовочная DISAMATIC 2110 MK3 (ID № 97.2704) в составе: формовочная машина; стержнеукладчик; электронная панель оператора PLC; два конвейера; лестницы и площадка обслуживания. **2. Бункер (формовочной смеси) с отводным конвейером и воронкой**	
Начальная цена	216 000 евро с учетом НДС 20 %
Сумма задатка	10 000 евро. Сумма задатка перечисляется в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату проведения платежа
Задаток перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 37853865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638. Нерезидентами РБ задаток может перечисляться на в/с (евро): BY70BELB30120048350030226000	
Срок заключения договора купли-продажи: 20 рабочих дней после проведения аукциона	
Условия оплаты предмета аукциона	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в размере 100 % в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Если победителем признается участник – резидент РБ, то оплата за предмет аукциона осуществляется в белорусских рублях по официальному курсу НБРБ на дату проведения платежа. Если победителем признается участник – нерезидент РБ, то оплата за предмет аукциона осуществляется в евро	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.06.2021	
Дата и время проведения аукциона	**27.08.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата и время окончания приема документов	**25.08.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Утерянный договор страхования Зеленая Карта (все страны) 15 дней серия BY07 № 20315116 и Белтассистанс серии БА № 1803958 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным.**

УНП 100357923

Ніякіх сакрэтаў

СЯМ'Я НЕ БЕЗ... СВЕКРЫВІ

Хто часцей за ўсё звяртаецца да гродзенскіх судовых экспертаў па ДНК-тэсты?

Здараецца так, што ўедлівыя свякрові раптам заўважаюць «чужыя» рысы ў сваіх малых унукаў. Трымаць сябе ў руках, вядома, не кожнаму пад сілу. Сумненні раз-пораз даходзяць да навакольных, у тым ліку да вушэй бацькі. І вось ужо сямейныя спрэчкі перакідваюцца ў новае рэчышча. Мала якая меладрама абыходзіцца без такіх эпізодаў. Дарэчы, як і рэальнае жыццё.

Сітуацыя хоць і непрыемная, але вырашальная. У такіх выпадках расставіць усе кропкі над «і» дапамагае экспертыза ДНК. Як расказаў «Звяздзе» **начальнік упраўлення лабараторных даследаванняў рэчавых доказаў біялагічнага характару ўпраўлення ДКСЭ па Гродзенскай вобласці Сяргей АРАНОВІЧ,** на год па тэсты ДНК звяртаецца да 200 жыхароў вобласці.

На дапамогу крыміналістам

Спецыяльная лабараторыя для аналізу ДНК працуе ў Гродне больш за пятнаццаць гадоў. Асноўны напрамак — экспертыза для праваахоўных органаў. Эксперты-крыміналісты ўваходзяць у склад следчых груп і выязджаюць на ўсе выпадкі правапарушэнняў. Яны шукаюць у тым ліку сляды біялагічнага паходжання на розных прадметах. Біяматэрыял можа быць на патэльні, нажы, крэсле, вазе і многім іншым. Калі злачынца пакінуў на месцы біялагічны матэрыял, яго знойдуць і даследуюць.

На кожны від слядоў ёсць свае біялагічныя метады. У гродзенскай лабараторыі даследуюць звыш 20 маркераў ДНК. Верагоднасць выпадковага супадзення біяматэрыялу, як вядома, практычна нулявая. ДНК, ці дэзоксірыбануклеінавая кіслата, — гэта інфармацыя, якую чалавек атрымаў ад бацькоў і якая потым захоўваецца ва ўсіх яго клетках і тканках. На гэтай уласцівасці ДНК і заснаваная работа экспертаў.

Сын ты мне ці не сын?

Цяпер даволі запатрабаваная становіцца экспертыза біялагічнага сваяцтва. Даследаванні можна праводзіць і ананімна. Праўда, такія аналізы для суда не маюць сілы. Узоры павінны браць самі эксперты, афармляецца адпаведны дакумент. Тады экспертыза мае юрыдычную сілу і суд можа прыняць яе да разгляду. Гатовыя тэсты павялічваюць хуткасць судовага працэсу, таму што людзі прыходзяць з афіцыйнымі вынікамі экспертызы. Калі хтосьці не згодны з імі, суд прызначае сваю экспертызу. Часцей за ўсё такія моманты не аспрэчваюцца. Многія звяртаюцца па тэсты, што называецца, «для сябе». Чалавек прыходзіць самастойна, каб устанавіць ці абвергнуць біялагічную роднасць. Некаторыя сітуацыі выклікаюць у экспертаў здзіўленне. Сяргей Арановіч прыгадаў такую гісторыю.

— Быў выпадак, калі да нас звярнуўся мужчына. Дзесьці праз дзесяць гадоў ён успомніў, што сустракаўся з жанчынай, якая раптам пачала яго пазбягаць. Аказалася, што ў яе ёсць дзіця, з'яўленне якога супадае з перыядам сустрэч. Ён падумаў, што гэта можа быць яго дзіця, і вырашыў правесці тэст ДНК. Пры гэтым мужчына быў жанаты і меў дзяцей ад жонкі. Ён не збіраўся ўлазіць у сям'ю той жанчыны, але гатовы быў дапамагаць матэрыяльна роднаму дзіцяці. Правесці тэст ён хацеў так, каб жанчына не ведала аб гэтым.

Сваё жаданне мужчына растлумачыў добрым матэрыяльным становішчам. Праўда, свояцтва не пацвердзілася.

Часцей за ўсё праводзяцца тэсты з малымі дзецьмі. Значна радзей — з тымі, каму 7-12 гадоў. Праўда, быў выпадак, калі прывялі 40-гадовага сына. У бацькі ўзнікла сумненне пасля таго, як жонка падчас сваркі заявіла, што, маўляў, дзіця не ад яго. Мужчыну гэта зачапіла. Праўда, той дарэмна хваляваўся. ДНК яго і сына супадаюць. Але ці варта даводзіць да такога сваіх мужоў?

Калі маці мужа сумняваецца...

Як аказалася, даволі часта па тэсты ДНК звяртаюцца свякрові, якія любяць правяраць нявестак. Альбо іншыя сваякі мужа, незадаволеныя нявесткамі. Былі выпадкі, калі свякроў спачатку правярала свояцтва дзяцей аднаго сына, а калі з'яўліся дзеці ў другога, то і яго таксама. Узоры свякроў прыносіла ананімна. Хутчэй за ўсё, нявесткі не ведалі, што ў іх аднасінах праводзіліся такія праверкі. Але падазрэнні не пацвердзіліся. Усе сыны былі біялагічнымі бацькамі сваіх дзяцей. Такім чынам, экспертыза супакоіла недаверлівую свякроў.

Аднойчы мужчына прывёў на аналіз дзяўчыну, якой было ўжо больш за 20. Тэст пацвердзіў, што гэта яго дачка. Аказалася, што ён сустрэў сваё былое каханне — жанчына расказала, што ў яе дарослая дачка. Мужчына запытаў, а ці не яго? — А можа, і твая... Праверылі: аказалася, так і ёсць. Па словах Сяргея Арановіча, дарослая дачка ўспрыняла гэты факт спакойна, не выглядала пакрыўджанай.

Некалі жанчына прывяла на экспертызу дваіх мужчын. Яна нарадзіла дзіця і такім чынам вырашыла даведацца, хто бацька. З ім яна меркавала стварыць сям'ю. Самае цікавае, заўважае мой субяседнік, што абодва мужчыны нармальна паміж сабой размаўлялі і былі нават падобныя адзін на аднаго. Абодва — высокія брунеты. Магчыма, і па знешнім выглядзе дзіцяці цяжка было вызначыць, хто ж з іх бацька. Але экспертыза праліла святло на рэчаіснасць. Сапраўды, біялагічным бацькам быў адзін з іх. А ці засталася з ім тая жанчына, невядома.

antro-med.ru

А вось іншая пікантная гісторыя. Дзяўчына па чарзе прывозіла траіх патэнцыяльных бацькоў свайго дзіцяці. Але ніводны з трох тэстаў не пацвердзіў свояцтва. Іншых прэтэндэнтаў на ролю бацькі маладая жанчына так і не прывяла.

Клановыя «разборкі»

Экспертыза дапамагае «разруліць» самыя важныя пытанні — сямейна-радавыя. Іх вырашэнне здымае шэраг праблем на гады наперад. У іх ліку пытанне аліментаў. Не рэдкі факт, калі выпадковая сувязь прыводзіць да цяжарнасці, а хлопец адмаўляецца ад адказнасці. Экспертыза дапаможа разабрацца, і пытанне аліментаў будзе вырашана. Такіх выпадкаў даволі шмат, адзначае Сяргей Арановіч і прыводзіць наступны прыклад.

Аднойчы хлопец прынёс узоры ДНК дзіцяці. Да яго звярнулася дзяўчына, з якой ён правёў час пасля дыскатэкі. Калі нарадзілася дзіця, яна сказала, што той — бацька. Але ДНК маладога чалавека не супала з тым, якое мае дзіця. Хлопец не хаваў сваёй радасці нават у прысутнасці экспертаў. А бываюць і даволі агрэсіўныя наведвальнікі.

— Справа ледзь не да бойкі даходзіць, — прыгадвае суразмоўнік. — Нейкія людзі прыйшлі на экспертызу з сапраўднымі групамі падтрымкі. Адзін — са сваякамі, другая — таксама са сваёй групай. Пакуль бралі ўзоры для экспертызы, гэтыя групы паміж сабой даволі тэмпераментна высвятлялі адносіны. Камені, палкі ў машыну кідалі, праклёны ў адрас адзін аднаго. Супакоіліся толькі пад пагрозай з'яўлення міліцыі.

Часам прыходзяць па тэст пры нараджэнні дзіцяці. Калі мужчына прызнае бацькоўства, ён рэгіструе дзіця на сябе.

Бывае, што людзі жылі ў шлюбе, разышліся, але шлюб не скасавалі. Калі дзіця нараджаецца да 10 месяцаў пасля рэгістрацыі шлюбу, яно запісваецца на былога мужа, хоць усе ведаюць, што дзіця не ад яго. Такія правілы ўстаноўлены, каб абараніць правы дзяцей. Запіс аб бацькоўстве анулюецца судом пасля таго, як экспертыза ўстановіць, што дзіця не яго. Дарэчы, не пацвярджаецца ў выніку экспертызы чвэрць выпадкаў. Апошняе не значыць, што кожны чацвёрты выхоўвае не сваё дзіця, заўважае спецыяліст. Гэта адносіцца толькі да тых, хто звярнуўся па экспертызу.

Тэст на... мацярынства

У экспертызе зацікаўленыя як жанчыны, так і мужчыны. Адпаведна, ініцыятарамі могуць быць абодва бакі, хоць і з рознымі матывамі. Напрыклад, жанчына хоча ўстанавіць факт бацькоўства, каб прыцягнуць мужчыну да адказнасці, прынамсі, у выглядзе аліментаў. Мужчына, наадварот, часта ініцыіруе тэст, каб аліменты не плаціць.

Рэдка, але бываюць выпадкі правядзення тэста на мацярынства. Сяргей Арановіч згадаў сітуацыю, калі жанчына нарадзіла дзіця дома. Яна не назіралася ў паліклініцы — магчыма, з рэлігійных прычын. Але зарэгістраваць дзіця без пацвярджэння ўрача немагчыма. Хто дакажа, што гэта менавіта яе дзіця? Вось тады жанчына вымушаная звярнуцца па тэст ДНК. Такія экспертызы праводзілі неаднойчы. Некаторым ДНК-тэсты неабходна зрабіць з-за памылкі ў перадачы прозвішчаў. Напрыклад, дачка — беларуска, маці — іншаземка, у дакументах — розніца ў напісанні адной літары. Экспертыза ДНК здыме пытанне аб свояцтве ў справах, датычных грамадзянства і міграцыі.

А вось сурагатная маці не будзе мець ДНК дзіцяці, калі яна не была донарам яйцаклеткі. Яна проста выношвае чужое дзіця.

Эксперты таксама ўстанаўліваюць свояцтва з памерлымі. Як правіла, гэта датычыцца судовых спраў. Напрыклад, жанчына застаецца адна з сынам, бацька памёр, і тая хоча пацвердзіць, што памерлы — бацька. Калі смерць мела крымінальны характар, у лабараторным архіве можа быць біялагічны матэрыял у высушаным выглядзе. Як правіла, ён захоўваецца 10 гадоў. У такім выпадку па рашэнні суда альбо следчых органаў можна правесці падобную экспертызу. Вельмі важна, каб узоры, нават тыя, што прыносяць ініцыятары тэстаў, захоўваліся ў папяровых канвертах, а не ў поліэтыленавых пакетах ці шкляных ёмістасцях. У паперы ўзор захоўваецца вельмі доўга.

Па словах Сяргея Арановіча, на год да гродзенскіх экспертаў паступае да 200 зваротаў па пытанні свояцтва ад жыхароў усіх рэгіёнаў. І попыт не зніжаецца...

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

У КЛЕЦКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У той бітве вада ў Лані стала чырвоная ад крыві. Да гэтага часу месца пад Клецкам, дзе адбылася крывавая бітва і была атрымана цяжкая перамога над татарамі, называюць Чырвонаставам. У 1996 годзе ў гонар 490-й гадавіны бітвы ўсталяваны помнік.

У свой час Клецк быў цэнтрам кальвінізму, уласнасцю князёў Радзівілаў, пад уладай Польшчы. Летам 1863-га ў вёсцы Заастравечча адбылася сутычка паўстанцаў Кастуся Каліноўскага з царскімі жандарамі і казакамі. У 1905—1907 гадах тут успыхнулі рэвалюцыйныя выступленні сялян пад кіраўніцтвам мясцовых бальшавікоў. Забастоўкамі паштовых работнікаў і хваляваннямі сялян кіраваў ураджэнец Клецка Леў Кучынскі.

У сярэдзіне 1917-га на Клеччыне ўстаноўлена савецкая ўлада. У другой палове красавіка 1919-га Клецк акупавалі палякі. У 1921 годзе па ўмовах Рыжскага дагавора горад увайшоў у склад Польшчы. А 17 верасня 1939-га быў вызвалены Чырвонай Арміяй.

27 чэрвеня 1941 года раён акупавалі немцы. Супраць ворага пачалася ўпартая партызанская барацьба, дзейнічала падполле.

Дзякуючы працоўнаму гераізму жыхароў, пасля вайны рэгіён быў адноўлены з попелу.

Сёння Клецкі раён дынамічна развіваецца ва ўсіх кірунках — сельскагаспадарчым, прамысловым, сацыяльным, культурным. Гонар раёна — 10 народных і 6 узорных калектываў мастацкай самадзейнасці.

Клецкая зямля дала свету шмат знакамітых людзей: рэвалюцыянерка Ева Фялінская, вядомы геолаг, удзельнік рускай палярнай экспедыцыі Канстанцін Валасовіч. На Клеччыне прайшлі дзяцінства і юнацтва вядомых вучоных, публіцыстаў, літаратараў: Міхаіла Яраша, Мікалая Абабуркі, Ізмаіла Хасена, Алеся Звонака, Леаніда Галубовіча, опернага спевака Леаніда Мурашкі і іншых. У вёсцы Морач жыў Аляксандр Сільвашка — удзельнік сустрэчы саюзных войскаў на Эльбе ў 1945 годзе.

Клецкі раён — Радзіма васьмі Герояў Сацыялістычнай Працы, 23 заслужаных работніку Рэспублікі Беларусь, 33 кавалераў ордэна Леніна.

Клеччына — найпрыгажэйшы край лясоў і палёў, дзе і сёння жывуць працавітыя людзі, патрыёты сваёй Радзімы, якія шануюць і берагуць традыцыі продкаў, багатую гісторыю свайго краю, імкнуцца зрабіць родны кут багацейшым і камфортнейшым для жыцця. Шмат робіцца ў раёне ў плане добраўпарадкавання. Райцэнтр і населеныя пункты з кожным годам мяняюцца літаральна на вачах. Нездарма кажуць, што ў Клецку ўсё па-свецку.

ВЯСЁЛКІ Ў РАСІНКАХ: ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І НЕ ТОЛЬКІ

З творчасцю Галіны НУПРЭЙЧЫК добра знаёмыя не толькі жыхары Клеччыны, але і Мінскай вобласці, і ўсёй краіны. Галіна Іосіфаўна — член Саюза пісьменнікаў Беларусі. У аграгарадку Туча Клецкага раёна прайшло яе дзіцянства, юнацтва. У школьныя гады пачала пісаць вершы. А натхніла яе на творчасць, як прызналася сама Галіна Нупрэйчык, тамтэйшая прырода незвычайнай прыгажосці.

Дырэктар ЦРБ Сяргей КАЗЛОЎСКІ, кіраўнік ансамбля Юрый ЭВЕРТ, пісьменніца Галіна НУПРЭЙЧЫК, загадчык аддзела бібліятэкі Святлана ГАРБУЗ.

— Колькі разоў была з мамай у лесе, назірала за паводзінамі звяроў, птушак, за раслінамі. Побач з населеным пунктам працякае рака Случанка, якую месцічы называюць возерам, бо яна вельмі шырокая. Кожны год туды прылятаюць лебедзі. І цяпер бываю ў вёсцы часта. Любы гэты куточак майму сэрцу, які называецца малой радзімай.

Свае вершы творца пачынала друкаваць у раённай газеце, пазней — у рэспубліканскіх выданнях: «Белорусской ниве» — цяпер «Сельская газета», «Літаратура і мастацтва», у часопісах «Гоман», «Вожык», «Рюкзачок. Веселый зоопарк». Галіна Нупрэйчык піша вершы розных тэматыкі: філасофскія, патрыятычныя, дзіцячыя, прысвечаныя роднай прыродзе. Нядаўна ў яе выйшаў зборнік вершаў «Вясёлкі ў расінках». Мастацкае афармленне гэтай кніжкі належыць дырэктару Клецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі Сяргею Казлоўскаму.

— Я доўга шукала мастака, хацелася, каб тэкст быў аздоблены не мульцяшнымі карцінкамі, не з інтэрнэту. Сяргей Казіміравіч уважліва прачытаў вершы і да кожнага тэматычнага раздзела намаляваў жывыя карцінкі. Яго работа вельмі спадабалася Юрасю Некратку, які рэдагаваў кнігу. Сапраўднае імя — Юрый Гарбачоў, паэт, празаік, шмат друкуецца, член-заснавальнік Мінскага абласнога народнага клуба паэтаў і кампазітараў «Жывіца», член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

«Вясёлкі ў расінках» — другая ўласная кніга паэтэсы. Першая, «Пясчынкі часу», выйшла ў 2011 годзе. Галіна Нупрэйчык друкуецца таксама ў калектыўных абласных зборніках. Яна — член клуба «Жывіца». Гэты клуб узначальвае Ірына Аляксандраўна Карнавухава, дзіцячая пісьменніца, музыкант, літаратар, член Беларускага саюза музычных дзеячаў, член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы.

Галіна Іосіфаўна друкавалася і ў калектыўных зборніках вершаў: «Верыцца ў лепшае, хочацца верыць» — 1993 год, «Валошкі ў жыце» — 2003-і, «Табе, наш горад, прысвячаецца» — 2011-ы. Вершы таксама былі змешчаны ў кнізе хрысціянскай паэзіі «Пад залатым купалам» — 2011-ы. У 2010 годзе на свяце «Калядныя званы» ў Маладзечне атрымала дыплом за ўвасабленне мастацкага вобраза ў вершы. Галіна Нупрэйчык — член Клецкага раённага літаратурнага аб'яднання «Голас». У яго ўваходзяць паэты, празаікі. Сярод іх ёсць «ветэраны» — Аляксандр Жукоўскі, Віктар Худавец, Лілія Мялешка, а таксама творцы больш маладога веку. Вершы Аляксандра Жукоўскага кампазітар Эдуард Зарыцкі паклаў на музыку. На вершы Лініі Мялешкі музыку напісаў кіраўнік жаночага ансамбля «З песняй па жыцці» Юрый Эверт.

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі з Клеччыны тры творцы — Лілія Мялешка, Таццяна Цвірка і Галіна Нупрэйчык.

«Голас» цесна супрацоўнічае з мясцовай бібліятэкай, часта ладзяцца сумесныя мерапрыемствы. Сёлета правялі творчы вечар Юрыя Эверта і Аляксея Лапаты — камерцыйнага дырэктара Клецкага механічнага завода. Абодва людзі творчыя: Юрый Раманавіч выдатна валодае ігрой на баяне, а Аляксей Паўлавіч — на гітары. Атрымаўся выдатны дуэт, які гледачы ўспрынялі на «ўра». Ладзяцца таксама конкурсы на найлепшае чытанне вершаў. У іх удзельнічаюць школьнікі, навучэнцы ліцэя. Некаторыя з іх таксама спрабуюць свае сілы ў паэтычнай творчасці.

КНІГА ЗАСТАНЕЦЦА НА ЎСЕ ЧАСЫ

Цэнтральная раённая бібліятэка працуе з адным выхадным на тыдзень

З 1946 года вядзе адлік сваіх старонак Клецкая цэнтральная раённая бібліятэка. За гэтыя гады ўстанова стала сапраўдным цэнтрам прапаганды гісторыі роднага краю, выхавання маладога пакалення на прыкладзе найлепшых айчынных і сусветных твораў, садзейнічання адраджэнню і развіццю нацыянальнай культуры, захаванню гісторыка-культурнай спадчыны. Бібліятэка актыўна займаецца выдавецкай дзейнасцю. Заснаваны серыі «Нашы землякі», «Творчая скарбонка», «Памяць Клеччыны». У межах гэтых серый выдадзены буклеты: «Леаніду Галубовічу — 80 год», «Летапіс памятных падзей Клеччыны», «Крыніц жыватворных вытокі», «Ад прыгажосці прыроды — да прыгажосці душы», «Крыніца натхнення — любові крыніца», «Аграгарадок — у будучыню крок», «Клеччына вершаваная», «Скарбніца мудрасці і асветы», «Са спадчынай продкаў у будучыню» і іншыя.

У бібліятэцы працуюць часовыя і пастаянныя дзеючыя выстаўкі, тэматычныя паліцы, выстаўкі-прагляды, выстаўкі прысвечаныя знамянальным і памятным датам: краязнаўчая «Клецкая зямля гісторыяй багата», экалагічная «Наш, мой дом — планета Зямля», літаратурная «Скарбы роднага слова» і іншыя.

Пры ўстанове дзейнічаюць культурна-аздараўленчы клуб «АІР», літаратурна-музычная гасцёўня «Суразмоўнік», клуб аматараў шахматаў і шашак «Дэбют», клуб для старшакласнікаў «Равеснік».

— Бібліятэка абслугоўвае больш як дзве тысячы карыстальнікаў, штогод выдае больш за 36-38 тысяч экзэмпляраў выданняў, папаўняецца кніжны фонд, у тым ліку і сацыяльна значнай літаратурай, і па нашых запытах. Жыхары горада і раёна таксама дораць нам кнігі, якія апрацоўваем і ставім на ўлік. Напрыклад, Аляксандр Мікалаевіч Жукоўскі ўсю сваю бібліятэку перадаў нам, — распавёў **дырэктар ЦРБ Сяргей КАЗЛОЎСКІ.**

Сяргей Казіміравіч, і ўсё ж моладзь аддае перавагу электронным носьбітам. Ці не так? — пацікавілася ў свайго суразмоўніка.

— Электронныя носьбіты, гаджэты, можна сказаць, вельмі хутка сябе зношваюць. Гэтая мода, як прыйшла, так знянацку і праходзіць. Кніжны варыянт застаецца нязменны ва ўсе часы. Кніга перажыла многія ліхалецці, нават вайну, і цяпер запатрабаваная. Таму ад электронных носьбітаў не адмаўляемся, пераглядаем, перапрацоўваем інфармацыю на іх. Але сапраўднай рэальнасцю ўсё ж з'яўляецца папяровая кніга, — лічыць Сяргей Казлоўскі.

— Бібліятэка працуе з адным выхадным у панядзелак. Мы радыя таму, што ў нас ёсць чытачы і з'яўляюцца новыя. Здавалася б, нядзеля — выхадны дзень, людзі адпачываюць. Але яны прыходзяць ва ўстанову з самага ранку, выбіраюць літаратуру, перыядычныя выданні, працуюць у чытальнай зале, — працягвае Сяргей Казлоўскі.

Каб крочыць у нагу з часам, бібліятэчныя работнікі выкарыстоўваюць сучасныя падыходы, новыя формы работы з насельніцтвам. Напрыклад, калі ёсць жыхары, якія не могуць прыйсці, яны па тэлефоне агаворваюць, што б тыя хацелі пачытаць. Па атрыманых заяўках дастаўляюцца неабходныя кнігі. На вёсцы, згодна з зацверджаным графікам абслугоўвання дома, кожны чацвер сельскія бібліятэкары разносяць кнігі ўсім жадаючым.

Попытам карыстаецца і паслуга бібліёбуса — своеасаблівай бібліятэкі на колах. На сённяшні дзень яна абслугоўвае дзевяць маршрутаў, якія ўключаюць 25 маланаселеных і аддаленых вёсак. Жыхары гэтых паселішчаў з нецярпеннем чакаюць машыну раз на тыдзень. Разам з бібліёбусам выязджаюць самадзейныя артысты. Бібліятэка ладзіць шмат акцый. У прыватнасці, напярэдадні калядных свят бібліёбус дастаяўляе Дзеда Мароза і Снягурку, якія віншуюць жыхароў. Словам, ніхто не абдзелены ўвагай.

Дарэчы, Сяргей Казлоўскі валодае шматлікімі творчымі талентамі. Выдатны мастак, займаецца ткацтвам слуцкіх паясоў. Ён нікому не адмаўляе ў майстар-класах, заўсёды гатовы навучыць рамяству кожнага ахвотнага, перадаць яму свае веды.

ЎСЁ ПА-СВЕЦКУ

ПТУШКА ТВОРЧАГА НАТХНЕННЯ — БУСЕЛ

Вячаслаў Алешка — партыйны дзеяч, пісьменнік, фатограф

Мемарыяльны комплекс савецкім воінам, партызанам і жыхарам раёна, загінулым у гады Вялікай Айчыннай вайны, што ў Клецку, бадай, адзіны такі ў краіне. Ён адкрыты па ініцыятыве першага сакратара райкама партыі Вячаслава Алешкі ў 1975 годзе. Вячаслаў Іосіфавіч займаў гэтую пасаду з 1973-га да 1983 года.

У цэнтры комплексу размешчаны 15-метровы пілон. Тут знаходзяцца ўзгорак з мемарыяльнай сцяной, дзе высечаны прозвішчы воінаў, што загінулі пры вызваленні Клецка, Вечны агонь у пяціканцовай рэльефнай аправе, алея і пяць бетонных блокаў з мемарыяльнымі дошкамі, дзе выбітыя найменні воінскіх часцей і партызанскіх злучэнняў, што вызвалялі горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

З правага боку каля ўвахода — яшчэ адзін блок з надпісам, прысвечаным жыхарам Клецкага раёна, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Стваральнікі праекта — архітэктары Яўген Кавалеўскі, Сяргей Карпаў і Валерый Рысакоў.

А 9 мая 2019 года каля ўвахода ў прыгожы парк, дзе знаходзіцца комплекс, урачыста адкрылі памятны знак у гонар Вячаслава Іосіфавіча Алешкі. У тэматычнай кампазіцыі яго аўтары паспрабавалі адлюстраваць маштаб асобы гэтага чалавека, які шмат зрабіў для развіцця раёна, яго багаты ўнутраны свет, захапленні. Вячаслаў Іосіфавіч 40 гадоў свайго жыцця прысвяціў фотасправе. За гэты час ім было зроблена больш як 1000 унікальных здымкаў, выпушчана сем кніг аб прыродзе, ілюстраваных фота.

Бусел, які лунае ў мірным небе, з'яўляецца сэнсавым цэнтрам кампазіцыі: гордая птушка не раз станавілася аб'ектам натхнення для фотаработ Вячаслава Алешкі.

З ПЕСНЯЙ ПА ЖЫЦЦІ

Жаночы вакальны ансамбль «З песняй па жыцці» быў створаны крыху больш як тры гады таму, але за гэты кароткі час заваяваў прызнанне гледачоў

— У ім удзельнічаюць жанчыны даволі сталага ўзросту, якім за шэсцьдзясят. Як цяпер модна казаць, 60+. Але для іх музыка, песня — неад'емная частка жыцця. Большасць з іх пела ў самадзейных калектывах. Гэта людзі розных прафесій — настаўнікі, работнікі культуры, знаёміць з калектывам яго стваральнік і кіраўнік Юрый Эверт. — Даём канцэрты ў вёсках раёна, удзельнічаем у святах беларускага пісьменства. Жанчыны даволі актыўныя. Не прапускаюць ніводнай рэпетыцыі, якія праводзім два разы на тыдзень. Калі не паспяваюць своечасова дабрацца ў райцэнтр, то прыязджаюць нават на таксі. Лічу, што ў іх даволі высокі самадзейны ўзровень. Чаму? У іх няма спецыяльнай музычнай адукацыі. Толькі я прафесійны музыкант — закончыў музычна-педагагічнае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута і Брэсцкае музычнае вучылішча.

Такія краявіды натхняюць артыстаў на творчасць.

Узрост удзельніц ансамбля, якія раслі, сталелі ў часы СССР, дыктуе і рэпертуар. Яны выконваюць песні савецкіх кампазітараў: рускамоўныя займаюць дзесьці 30 %, астатнія беларускія. Ёсць адна польская і адна ўкраінская. Усяго ж у рэпертуары каля 55 песень.

— У Клецку ладзяцца святы вуліц. Жаданы госць тут і ансамбль «З песняй па жыцці». Жыхары вельмі любяць слухаць песні ў выкананні гэтага калектыву, які пяе пад баян, без фанаграмы. Жыхарам тыя песні знаёмыя, яны нават падпяваюць артыстам. На маю думку, калектыў заслугоўвае асаблівай павагі. Яго ўдзельнікі не шкадуюць сілы, энергіі і дораць насельнікам нашага невялікага, але ўтульнага і прыгожага гарадка радасць. Акрамя таго, яны з'яўляюцца актыўнымі чытачамі нашай бібліятэкі — прыходзяць не па адну кніжку, а бяруць цэлую торбу, як раней у магазіне бралі хлеб, — радуецца дырэктар ЦРБ Сяргей Казлоўскі.

МУЗЕЙНАЯ СКАРБОНКА

Музей гісторыі Клеччыны часова закрыты для наведвальнікаў, паколькі па сценах будынка пайшлі трэшчыны і ён мае патрэбу ў рэканструкцыі. У сувязі з гэтым яго супрацоўнікі былі вымушаныя памяняць фармат работы.

— Мы кожны тыдзень ладзім выстаўкі пад адкрытым небам, калі дазваляе надвор'е. Другі раз праходзіць выстаўка работ выхаванцаў народнай дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва Рышарда Мая «У краіне дзяцінства». Рышард Антонавіч — наш зямляк, нарадзіўся ў вёсцы Сіняўка, дызайнер, мастак. Ён падарыў музею 30 карцін, якія папоўнілі фонды. Наведвальнікам, асабліва дзецям, вельмі падабаецца экспазіцыя, яны проста ў захапленні ад палотнаў сваіх равеснікаў, — распавяла **старшы навуковы супрацоўнік Вольга ЯФРЭМАВА.**

— Акрамя нашага музея, палотны Рышарда Мая знаходзяцца ў фондах Zimmerly Art Museum (ЗША), прыватных калекцыях Беларусі, Польшчы, Галандыі, Германіі, Аўстрыі, Францыі, Ізраіля, ЗША, Тайваня і іншых краін, — працягвае Вольга Мікалаеўна. — Сёлета Рышарду Антонавічу спаўняецца 85 гадоў, і, відаць, ён вырашыў перадаць работы нам, каб на малой радзіме засталася памяць аб яго студыі.

Шмат уражанняў прынесла наведвальнікам і фотавыстаўка, зладжаная нядаўна на жывой агароджы з боку вуліцы, з відамі старога горада. Яны здзіўляліся таму, як выглядаў Клецк раней і які стаў цяпер. Розніца відавочная.

— Мы ўжо некалькі гадоў распрацоўваем і праводзім розныя квэсты, гульні. Стараемся больш выкарыстоўваць інтэрнэт, ладзім віртуальныя выстаўкі, размяшчаем інфармацыю на сайце музея. Вядзём таксама праекты — рубрыкі ў сацыяльных сетках, напрыклад, такія як «Музейная скарбонка». Тут выстаўляем найбольш цікавыя экспанаты, знаёмім карыстальнікаў кожны тыдзень з новым экзэмплярам. У «Календары падзей» расказваем, што адбывалася ў свеце за месяц, якія адзначалі юбілейныя даты, — расказала **навуковы супрацоўнік музея Ганна БАЙРАШЭЎСКАЯ.**

Супрацоўніцы музея.

Карыстаюцца попытам пешыя экскурсіі па горадзе, у асноўным па яго гістарычным цэнтры. Тут калісьці стаяў касцёл Святой Тройцы, першыя ўпамінанні аб ім адносяцца да 1450 года. У 1950-я гады ён быў разбураны. Каб людзі ўяўлялі, які быў храм, ім паказваюць віртуальную выяву, што зрабілі энтузіясты. Супрацоўнікі музея стараюцца не проста праводзіць экскурсіі, але і візуалізаваць іх.

Калісьці Клецк быў яўрэйскім мястэчкам. Сюды прыязджаюць патомкі выхадцаў з яго. Для іх ладзяцца экскурсійныя маршруты, якія ўключаюць ешыву — яўрэйскую навучальную ўстанову, будынак якой захаваўся, а таксама яўрэйскія могілкі, месца масавага расстрэлу яўрэяў, месца, дзе было клецкае гета.

У планах супрацоўнікаў музея шмат цікавых задумак. У прыватнасці, пазнаёміць кляччан з творчасцю яшчэ аднаго земляка — мастака, графіка Міхаіла Будавея. Дарэчы, гэта родны брат Рышарда Мая.

«Надзея» дорыць людзям аптымізм

Убачыць у кожным дзіцяці творчую іскрынку і даць ёй своечасова разгарэцца — такі дэвіз кіраўніка ўзорнай вакальнай студыі «Надзея» Зоі АЛЯКСЕЙЧЫК.

У студыі займаецца больш як 30 дзяцей ва ўзросце ад 5 да 16 гадоў, — расказвае Зоя Уладзіміраўна. — Гэта і малыя, якія толькі робяць першыя крокі на вялікую сцэну, і вопытныя ўдзельнікі. У ансамбля разнастайны рэпертуар, куды ўваходзяць дзіцячыя, сучасныя, народныя, эстрадныя песні, песні мясцовых кампазітараў. Значную частку рэпертуару займаюць творы патрыятычнага характару. Менавіта ў патрыятычных песнях пра Беларусь, родны край бачу тую сілу, якая дапамагае выхоўваць у дзяцей пеўчую культуру, пашыраць іх эстэтычны кругагляд. Хтосьці думае, што кіраваць калектывам, распісваць вакальную партытуру, прыдумваць і ўвасабляць сцэнічны нумар ці вобраз лёгка. Але творчая лёгкасць дасягаецца карпатлівай і настойлівай працай. На занятках па вакалу вядзецца актыўная работа над пастаноўкай голасу, развіццём яго яркасці і сілы, дыханнем, расшырэннем дыяпазону, спалучэннем спеваў з танцавальнымі рухамі, навыкамі работы з мікрафонам.

Словам, за песняй, якая выконваецца на адным дыханні, ляжаць напружаныя рэпетыцыі. А іх за 18 гадоў было безліч.

Увесь час «Надзея» не перастае развівацца. Уменне трымацца на сцэне, майстэрства прыходзяць з гадамі. Магчыма, таму выступленні вакальнай студыі — упрыгажэнне ўсіх канцэртных праграм.

Калектыў ансамбля, дзякуючы высокаму выканальніцкаму ўзроўню, разнастайнаму рэпертуару і артыстызму, здабыў прызнанне і на абласным узроўні. «Надзея» ўдзельнічала ў абласным фестывалі працаўнікоў вёскі «Дажынкі» ў Барысаве ў 2019 годзе. Калектыў выступаў на галоўнай пляцоўцы свята. Сёлета юныя артысты ўзялі ўдзел у абласным свяце, прысвечаным Дню медыцынскага работніка, якое праходзіла ў Нясвіжскім палацы Радзівілаў.

— Мы вучым дзяцей не толькі прафесіяналізму, але і чалавечым якасцям. Кожны занятак пачынаецца з добрага настрою і шчырай усмешкі. Адзначу, чым бы ні займалася дзіця, неабходна дапамагчы яму раскрыць унутраны свет і навучыць яго займацца творчасцю. Кожнае дзіця таленавітае па-свойму, а мы, дарослыя, павінны своечасова гэта ўбачыць. І нічога страшнага, калі малое жадае пець, а частата інтанірavання няўстойлівая. У пэўнай музыцы для яго ёсць выхад, галоўнае — не адштурхнуць, а навучыць, — кажа Зоя Аляксейчык.

Цяпер вакальны калектыў працуе над шоу-праграмай «Дарослыя і дзеці». Як адны, так і другія любяць гэты праект. Малыя зорачкі маюць магчымасць пець з дарослымі, а тыя з задавальненнем акунаюцца ў краіну дзяцінства.

Матэрыялы «Радзімазнаўства. Адрасы пісьменства» падрыхтавалі Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Анатоль КЛЯШЧУК *(фота)*.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «Житковичлес»** (УНП 400049968) 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80, в лице ликвидатора Лахвича Василия Адамовича, тел. 8 (02353) 2-18-74.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **24 августа 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

№ п/п	Предмет торгов	Где находится	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ 5-11, гос. № 6086 ЕК-3, 2018 г. в.	1	29925,00
2	Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ 5-11, гос. № 6089 ЕК-3, 2010 г. в.	1	24240,00
3	Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 4548-3 ЕК, 2018 г. в.	1	24624,00
4	Автомобиль МАЗ 6303-А8, гос. № АЕ 7921-3, с манипулятором гидравлическим М-75-04, 2010 г. в.	1	27702,00
5	Прицеп МАЗ 837810 (022), гос. № А 4816 А-3, 2010 г. в.	1	7695,00
6	МАЗ-5551 Самосвал, гос. № АВ 33-55-3, 1991 г. в.	1	6856,00
7	Автомастерская ЗИЛ 131 ПРМ, гос. № АІ 3858-3, 1990 г. в.	1	4386,00
8	Автомашина УРАЛ 4320-3, гос. № ЕМ 6265, 1996 г. в. (без постановки на учет) с Гидроманипулятором ПЛ 70-02, 2002 г. в.	1	9972,00
9	Автомобиль УАЗ*390945*330 № двиг. 409100*В3044904, № шасси 330360В0459912, гос. № АІ 1144-3, 2010 г. в.	1	5610,00
10	Легковой автомобиль «Фольксваген Пассат», гос. № 2054 ВС-3, 1998 г. в.	1	4986,00
11	Полуприцеп УПП1212, 1993 г. в. (без постановки на учет)	1	2216,00
12	Газ 53Автоцистерна АЦ-4.2, гос. № АА 9628-3, 1983 г. в.	1	9972,00
13	Автомобиль УАЗ-452, гос. № 7844-3 АО, 1980 г. в.	1	3740,00
14	Автомобиль УАЗ 390995-460-04, гос. № 1663-3 АМ, двиг. № 409110*Н3036855, VIN: ХТТ 390995J202995, 2017 г. в.	1	13082,00
15	МАЗ-53336 (бортовая), гос. № АК 21-49, 1991 г. в.	1	8310,00
16	Прицеп бортовой МАЗ 8926, гос. № 3785 АА, 1993 г. в.	1	2493,00
17	Автопогрузчик (львовский), 1990 г. в., инв. № 000260	2	4363,00
18	Грузовой бортовой ГАЗ-66-12, гос. № 4033-3 АМ, ш. 0456045, дв. 109082, 1986 г. в.	1	7618,00
19	Автомобиль Урал-375, гос. № 0813-3 АМ, 1980 г. в., (без постановки на учет)	1	5921,00
21	Брусующий станок TS 52-2R, инв. № 231	2	11810,00
22	Многопильный станок DS-55-IR, инв. № 233	2	11219,00
23	Вентилятор ВЦП6-45 № 8 с дв. 30/1500 люб. вращения ХВ, инв. № 238	2	1870,00
24	Вентилятор ВЦП6-45 № 8 без электродвигателя ХВ, инв. № 318	2	187,00
25	Пилорама РПМ -02-К б/у, инв. № 397	2	4363,00
26	Станок строгальный 4х сторон, инв. № 45 Т	2	6233,00
27	Станок Ц-6-2, инв. № 54 Т	2	748,00
28	Станок ШЛД-6, инв. № 56 Т	2	1247,00
29	Лесопильная рама ЛРВ-1 № 6951, инв. № 514	2	5921,00
30	Станок брусовочный двухвальный	1	12466,00
31	Вентилятор ВЦП 7-40 № 8 без эл. дв., инв. № 565	2	1247,00
38	Кусторез FS 460 С-ЕМ (с ножом для молодняка), инв. № 483	1	935,00
39	Молот пневматический, инв. № 000885	1	3116,00
40	Станок сверлильный 2Н 135, инв. № 001310	1	1454,00
41	Станок вертикально-фрезерный, инв. № 001311	1	2770,00
42	Мотопомпа, инв. № 001427	1	1558,00
43	Гидроманипулятор ОМТЛ-97, инв. № 262	1	3740,00
44	Станок мод.В3-367точильно-шлифовальный, металлореж, инв. № 36	1	415,00
45	Заточной станок Б/У, инв. № 68	1	139,00
46	Пост для ремонта легковых автомобилей, инв. № 001666	1	1558,00
47	Кондиционер GREE GWH12NA-K3NNB3A/1, инв. № 486	1	436,00
48	Кондиционер GREE GWH07AAA-K3NNA2A, инв. № 503	1	374,00
49	Кондиционер GREE GWH12AAB-K3NNB2A, инв. № 504	1	436,00
50	Кондиционер GREE GWH12NA-K3NNB3A/2, инв. № 487	1	436,00
51	Кондиционер GREE GWH07NA-K3NNB3A, инв. № 488	1	374,00
52	Автомобиль УАЗ 390995-460-04 № 0407-3 АМ, 2017 г. в.	1	12918,00
54	Станок многопильный деревообрабатывающий ЦМР-3 с рольгангами не приводными 3.000 (2 шт.), инв. № 563	1	6156,00
55	Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 5460-3 ЕК	1	31500,00
56	Трактор трелевочный ТТР-401 М-05 гос. № ЕК-3 7131 2010 г.	1	13680,00
